# РЭАНІМАЦЫЙНЫ ПАКЕТ РЭФОРМАЎ

# **ДЛЯ БЕЛАРУСІ**

# РЭАНІМАЦЫЙНЫ ПАКЕТ РЭФОРМАЎ **ДЛЯ БЕЛАРУСІ**

***Сумесная платформа палітычных арганізацый і незалежных экспертаў, якія аб’ядналіся, каб ініцыяваць пазітыўныя перамены ў Беларусі***

Мінск
2021

**Аб брашуры**

*Рэанімацыйны пакет рэформаў для Беларусі — гэта пакет праектаў рэформаў, які распрацаваны экспертамі дэмакратычных палітычных партый, грамадскіх арганізацый і незалежных прафсаюзаў.*

*Ён з'яўляецца рэакцыяй дэмакратычнай супольнасці на бяздзейнасць улады ў грамадска-палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай сферах жыцця, якія перажываюць глыбінны крызіс і патрабуюць неадкладнага рэфармавання.*

*Гэтыя прапановы — аснова для будучых законаў, вартых разгляду ў новым парламенце, які павінен з'явіцца ў выніку свабодных і справядлівых выбараў.*

*Некаторыя праекты рэформаў з'яўляюцца дыскусійнымі і друкуюцца ў гэтай брашуры для ўвядзення тэм у палітычны дыскурс.*

*Кожная арганізацыя адказвае выключна за свае прапановы, можа падтрымліваць праекты рэформаў іншых арганізацый або ўстрымацца ад такой падтрымкі.*

**Калектыў Рэанімацыйнага пакета рэформаў**






# ЗМЕСТ

Рэформа органаў дзяржаўнай улады 4
Рэформа судовай сістэмы 16
Рэформа партыйнай сістэмы 28
Рэформа сістэмы працоўных і звязаных з імі адносін 40
Рэформа энергетычнага сектара 52
Барацьба з карупцыяй (антыкарупцыйная платформа) 68
Рэформа па стварэнні новых працоўных месцаў 78
Рэформа выбарчага заканадаўства 88
Рэформа мясцовага самакіравання 96
Рэформа жыллёва-камунальнай гаспадаркі 108
Рэформа сістэмы аховы здароўя 116
Рэформа сектара нацыянальнай бяспекі 126

# РЭФОРМА ОРГАНАЎ ДЗЯРЖАЎНАЙ УЛАДЫ



*“Змены ў сістэме дзяржаўнага кіравання — гэта самая аснова працы, бо ў нас недэмакратычная дзяржава. У нас няма самастойных галін улады, але яны павінны быць. У нас няма парламента і, адпаведна, няма народаўладдзя. Гэта ўсё трэба ўдасканальваць.”*

*Генеральны сакратар БСДП*
*Мечыслаў Грыб*



**Арганізацыя, адказная за распрацоўку праекта рэформы:**
Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада).

**Прапановы распрацаваны экспертам**
Міхаілам ПАСТУХОВЫМ.



news.24tv.ua

## КАРОТКАЕ АПІСАННЕ

Сутнасць рэформы складаецца ў забеспячэнні вяртання да асноўных палажэнняў Канстытуцыі 1994 г., якая прадугледжвала функцыянаванне органаў дзяржаўнай улады на аснове прынцыпаў падзелу ўладаў, вяршэнства закона, павагі правоў чалавека, прызнання нормаў міжнароднага права. Важна стварыць збалансаваную і ўстойлівую сістэму стрымліванняў і процівагаў, каб пазбегнуць узурпацыі ўлады і канцэнтрацыі паўнамоцтваў у руках аднаго дзяржаўнага інстытута.



Аляксандр Ружэчка, onliner.by

## ПРАБЛЕМЫ, НА РАШЭННЕ ЯКІХ НАКІРАВАНА РЭФОРМА

У краіне дзейнічае новая рэдакцыя Канстытуцыі, якая была прынята ў выніку правядзення рэферэндумаў 1995, 1996 і 2004 гг. Гэтыя рэферэндумы былі праведзены па ініцыятыве Аляксандра Лукашэнкі з парушэннем дзейнага заканадаўства, з фальсіфікацыямі пры падліку галасоў выбаршчыкаў.

Прапанаваныя на рэферэндумах папраўкі ў Канстытуцыю 1994 г. не могуць мець юрыдычнай сілы. Утвораныя на іх аснове органы ўлады з'яўляюцца незаконнымі і падлягаюць скасаванню. Дадатковыя паўнамоцтвы Прэзідэнта, як і зняцце тэрмінаў для перавыбрання, могуць быць расцэнены як формы захопу і ўтрымання дзяржаўнай улады.

Галоўнай з праблем з'яўляецца аднаўленне дзеяння Канстытуцыі 1994 г. і стварэнне прававой асновы для дзейнасці новых органаў улады.

Аднак з часу прыняцця Канстытуцыі 1994 г. і адмены яе дзеяння пасля рэферэндуму 24 лістапада 1996 г. прайшло нямала часу. Таму спатрэбіцца ўнесці шэраг паправак у Канстытуцыю. Гэтыя папраўкі будуць тычыцца, найперш за ўсё, паўнамоцтваў вышэйшых органаў улады, у тым ліку Прэзідэнта краіны.

Рэпрэсіўная палітыка судоў і іх ідавочная тэндэнцыйнасць ставіць у парадак дня пытанне аб рэфармаванні дзейнай судовай сістэмы, органаў унутраных спраў, папярэдняга следства, спецслужбаў і пракуратуры.

Замест так званай "прэзідэнцкай вертыкалі" на месцах неабходна ствараць новыя органы мясцовага самакіравання і кіравання.

У мэтах узмацнення гарантый правоў грамадзян мэтазгодна прадугледзець дадатковыя сродкі іх абароны.

У адраджэнні маюць патрэбу асновы беларускай дзяржаўнасці, у тым ліку нацыянальная сімволіка, беларуская мова, гісторыя і культура.

## АСНОЎНЫЯ МЭТЫ / ЗАДАЧЫ РЭФОРМЫ

Мэтай рэформы сістэмы органаў дзяржаўнай улады з'яўляецца аднаўленне ў Беларусі законнасці, дэмакратыі і павагі да правоў чалавека.

Для дасягнення гэтай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

- ✓ануляваць усе змены, унесеныя ў Канстытуцыю 1994 г. па выніках рэферэндумаў 1995, 1996, 2004 гг.;
- ✓забяспечыць абранне легітымнага заканадаўчага органа для ўнясення змяненняў у Канстытуцыю 1994 г.;
- ✓забяспечыць прававую аснову для фармавання органаў дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання ў адпаведнасці з Канстытуцыяй 1994 г.;
- ✓скасаваць дзяржаўныя органы, якія не адпавядаюць палажэнням Канстытуцыі 1994 г.;
- ✓вярнуць беларускай мове статус адзінай дзяржаўнай мовы, а рускай мове надаць статус мовы міжнацыянальных зносін (як варыянт), вярнуць бел-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня" ў якасці дзяржаўных сімвалаў.






## КРОКІ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ РЭФОРМЫ

**1. Аднаўленне народаўладдзя ў краіне.**
Згодна з прэамбулай Канстытуцыя (1994 г.) прымаецца ад імя народа і для народа. Яна павінна забяспечваць грамадзянскую згоду, народаўладдзе, сцвярджаць правы і свабоды кожнага грамадзяніна.
Па Канстытуцыі народ з'яўляецца адзінай крыніцай дзяржаўнай улады (ч. 1 арт. 3). Народ мае права ажыццяўляць сваю ўладу як непасрэдна, так і праз прадстаўнічыя органы (ч. 2 арт. 3).
Тым самым, аднаўленне народам сваёй улады — гэта легальны шлях пераходу да дэмакратычнай формы кіравання. На працягу пераходнага перыяду могуць быць утвораны часовыя органы ўлады: часовы парламент, часовы ўрад, часовыя міністры, генеральны пракурор і іншыя.

**2. Арганізацыя і правядзенне выбараў у легітымны парламент.**
Згодна Канстытуцыі 1994 г., такім парламентам з'яўляецца Вярхоўны Савет.
Выбары ў Вярхоўны Савет можа прызначыць часовы прадстаўнічы орган народа. Ён жа можа сфармаваць часовы склад і Цэнтральнай выбарчай камісіі.

**3. Зацвярджэнне статусу Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь як вышэйшага прадстаўнічага пастаянна дзейнага і адзінага заканадаўчага органа дзяржаўнай улады.**
Прававой асновай для пераходу да дэмакратыі і законнасці ў краіне можа быць аднаўленне прыярытэтнай (пануючай) ролі парламента ў сістэме органаў дзяржаўнай улады. Ён павінен здабыць права выдаваць законы, фармаваць органы ўлады, ажыццяўляць кантроль за іх выкананнем.



iz.ru

**4. Унясенне змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю 1994 г.**
Асноўныя змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю 1994 г. павінны закрануць статус Прэзідэнта. Відавочна, што многія з прэзідэнцкіх паўнамоцтваў варта скасаваць. Магчыма, варта перайсці да абрання Прэзідэнта на пасяджэнні парламента. Адным з варыянтаў можа быць скасаванне пасады Прэзідэнта і ўскладанне яго асноўных паўнамоцтваў на старшыню парламента.
Скарачэнне паўнамоцтваў Прэзідэнта або скасаванне гэтай пасады павінна прывесці да пашырэння паўнамоцтваў парламента і ўрада. У новых умовах урад павінен стаць аўтарытэтным і ўплывовым органам улады. Ключавой фігурай у новым урадзе стане Прэм'ер-міністр.

**5. Фармаванне новых органаў дзяржаўнай улады.**
Пасля абрання легітымнага парламента — Вярхоўнага Савета — і ўнясення адпаведных змяненняў у Канстытуцыю будзе створана прававая аснова для фармавання новых органаў дзяржаўнай улады. Гаворка ідзе аб Прэзідэнце, урадзе, вышэйшых судах, кантрольных і наглядных органах, Нацыянальным банку, Цэнтрвыбаркаме, іншых органах і ўстановах.

**6. Унясенне змяненняў і дапаўненняў у дзейныя законы, прынятцце новых законаў; прызнанне часткі заканадаўства неадпаведным Канстытуцыі.**



Увесь масіў заканадаўства, прыняты ў перыяд праўлення Аляксандра Лукашэнкі, павінен быць перагледжаны з пункту гледжання адпаведнасці з Канстытуцыяй 1994 г. Важная роля ў гэтым пытанні будзе адведзена новаму складу Канстытуцыйнага суда.

**7. Скасаванне незаконных органаў і структур папярэдняй улады, заснаванне новых органаў, фармаванне органаў мясцовага самакіравання і кіравання.**
Рэфармаванне дзяржаўнага апарату пацягне за сабой абнаўленне (ратацыю) кадраў. Нядаўна створаныя органы (парламент, урад, міністэрствы, ведамствы, Цэнтрвыбаркам, Нацыянальны банк і інш.) будуць фармавацца на прынцыпова іншай аснове, у тым ліку шляхам абрання або конкурснага адбору. Мясцовыя прадстаўнічыя органы будуць створаны ў выніку новых выбараў, а адпаведныя выканкамы — шляхам даверу дэпутатаў мясцовых Саветаў.

**8. Правядзенне неабходных пераўтварэнняў у сферы дзейнасці органаў улады, у тым ліку судоў і іншых праваахоўных органаў.**
У прыватнасці, гаворка можа ісці аб правядзенні судова-прававой рэформы, рэформы органаў мясцовага самакіравання, рэформы Узброеных сіл, люстрацыі і інш.

**9. Аднаўленне нацыянальнай дзяржаўнай атрыбутыкі, дзяржаўнасці беларускай мовы.**





news.liga.net

## ОРГАНЫ, ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЬ РАШЭННІ

Прадстаўнічым органам беларускага народа на пэўны час можа стаць Усебеларускі з'езд (Сойм). Ён мае права ўтварыць іншыя часовыя органы і прыняць адпаведныя дакументы (рэзалюцыі).
Пасля правядзення выбараў парламент сфармуе астатнія органы ўлады.

## НАРМАТЫЎНЫЯ ПРАВАВЫЯ АКТЫ

Канстытуцыя 1994 г.

Папраўкі ў Канстытуцыю прымаюцца парламентам або па выніках рэспубліканскага рэферэндуму. Папраўкі не павінны прынцыпова змяняць сэнс Канстытуцыі.

Дзеянне нарматыўных актаў, прынятых органамі ўлады пасля 24 лістапада 1996 г., павінна быць прыпынена, а самі акты падвергнуты прававой ацэнцы.

***Адпаведныя змяненні і дапаўненні неабходна ўнесці ў наступныя законы:***

"Аб Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь" ад 21 снежня 1994 г.

"Аб Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь" ад 21 лютага 1995 г.

"Аб Кабінеце Міністраў Рэспублікі Беларусь" ад 30 студзеня 1995 г.

"Аб судовым ладзе ў Рэспубліцы Беларусь" ад 13 студзеня 1995 г.

"Аб Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь" ад 30 сакавіка 1994 г.

"Аб гаспадарчым судзе ў Рэспубліцы Беларусь" ад 5 чэрвеня 1991 г.

"Аб Кантрольнай палаце Рэспублікі Беларусь" ад 13 сакавіка 1992 г.

"Аб пракуратуры Рэспублікі Беларусь" ад 29 студзеня 1993 г.

"Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь" ад 20 лютага 1991 г.

"Аб асновах службы ў дзяржаўным апараце" ад 23 лістапада 1993 г.

"Аб народным галасаванні (рэферэндуме) у Рэспубліцы Беларусь" ад 13 чэрвеня 1991 г.

"Аб выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь" ад 27 кастрычніка 1989 г.

"Аб выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь" ад 29 сакавіка 1994 г.

"Аб выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў Рэспублікі Беларусь" ад 27 кастрычніка 1989 г.

# РЭФОРМА СУДОВАЙ СІСТЭМЫ




*“У выніку судовай рэформы ў нас павінны з’явіцца суддзі, якія стануць увасабленнем законнасці, прынцыповасці і справядлівасці. Для гэтага яны павінны выбірацца на сваю пасаду і служыць не ўладзе, а сваім выбаршчыкам.”*

*Старшыня экспертна-аналітычнай камісіі БСДП Міхаіл Пастухоў*



**Арганізацыя, адказная за распрацоўку праекта рэформы:**
Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада).

**Прапановы распрацаваны экспертам**
Міхаілам ПАСТУХОВЫМ.



reform.by

## КАРОТКАЕ АПІСАННЕ

Асноўнай праблемай у сферы дзейнасці судоў з'яўляецца тое, што суды фактычна страцілі сваю незалежнасць і самастойнасць.

Сутнасць судовай рэформы складаецца ў забеспячэнні належнай незалежнасці судоў пры разглядзе судовых спраў, павышэнні статусу судоў у сістэме органаў улады, узмацненне гарантый судовай абароны правоў і свабод грамадзян.

## ПРАБЛЕМЫ, НА РАШЭННЕ ЯКІХ НАКІРАВАНА РЭФОРМА

**1. Цэнтралізацыя судоў і залежнасць ад Прэзідэнта.**
Суддзі прызначаюцца на пасаду (і вызваляюцца ад пасады) Прэзідэнтам — кіраўніком дзяржавы. Перасоўванне суддзяў па службе, прысваенне ім класаў дзяржслужачых здзяйсняецца на падставе прэзідэнцкіх указаў.
У 2013 г. гаспадарчыя суды былі ператвораны ў эканамічныя суды і ўключаны ў сістэму судоў агульнай юрысдыкцыі. Вярхоўны суд атрымаў паўнамоцтвы па арганізацыйным, матэрыяльна-тэхнічным і кадравым забеспячэнні дзейнасці судоў. У выніку ўзмацнілася цэнтралізацыя судоў і падвысілася роля старшыні Вярхоўнага суда.

**2. Умяшанне кіраўнікоў судоў у дзейнасць па ажыццяўленні правасуддзя.**
Гэта выяўляецца, у прыватнасці, у тым, што судовыя працэсы па крымінальных справах сталі насіць відавочна выразны абвінаваўчы ўхіл. Суды нібы зрасліся з органамі папярэдняга следства і пракуратурай. Пры гэтым апраўдальныя прысуды сталі рэдкасцю. У Беларусі на 100 асуджаных прыпадае 2-3 апраўданых, што ў разы менш, чым у краінах Еўропы.

**3. Жорсткая рэпрэсіўная палітыка судоў.**
Асабліва гэта выяўляецца па справах так званай карупцыйнай скіраванасці, а таксама справах, якія звязаныя з наркотыкамі.
Суды агульнай юрысдыкцыі разглядаюць вялікую колькасць спраў аб адміністрацыйных правапарушэннях. Да адміністрацыйнай адказнасці штогод прыцягваецца каля 350-370 тысяч чалавек. Прыкладна ў 80% выпадкаў накладаюцца штрафы. У 17-18% ужываецца адміністрацыйны арышт.

**4. Палітызаванасць судовых рашэнняў.**
Адміністрацыйнае судаводства ў дачыненні да “палітычных спраў” ажыццяўляецца тэндэнцыйна, нярэдка з выкарыстаннем фальсіфікаваных матэрыялаў. Пастанову суддзі дапускаецца абскардзіць толькі ў наглядным парадку, што ў большасці выпадкаў не дае вынікаў.

**5. Нікчэмная роля Канстытуцыйнага суда. Канстытуцыйны суд уключаны ў судовую сістэму Рэспублікі Беларусь.**

Асаблівасцю статусу Канстытуцыйнага суда з'яўляецца тое, што яго новыя паўнамоцтвы былі вызначаны прэзідэнцкім дэкрэтам ад 26 чэрвеня 2008 г. № 14 "Аб некаторых мерах па ўдасканаленні дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь". Кіраўнік дзяржавы сваім актам дапусціў парушэнне Канстытуцыі і ўварванне ў сферу судовай арганізацыі.

З ліпеня 2008 г. Канстытуцыйны суд праверыў больш за 700 законаў у парадку папярэдняга канстытуцыйнага кантролю і, як ні дзіўна, не выявіў ні аднаго закона, які б парушаў Канстытуцыю.

На працягу апошніх 10 гадоў у Канстытуцыйны суд ніхто з упаўнаважаных суб'ектаў (Прэзідэнт, Урад, палаты парламента, Вярхоўны суд) не звяртаўся. Такая пасіўнасць названых суб'ектаў тлумачыцца, перш за ўсё, нежаданнем абвастраць адносіны з іншымі органамі ўлады. Акрамя таго, ствараецца ілюзія ідэальнай канстытуцыйнай законнасці ў краіне.

Канстытуцыйны суд не надзелены правам разглядаць звароты грамадзян аб парушэнні іх правоў і свабод у прынятых нарматыўных актах. Суд адхіляе такія звароты і прапануе звяртацца да "ўпаўнаважаных суб'ектаў". Тыя, у сваю чаргу, адмаўляюцца іх накіроўваць у Канстытуцыйны суд.

**6. Судовая сістэма Рэспублікі Беларусь застаецца нерэфармаванай з 90-х гадоў мінулага стагоддзя.**

Канцэпцыя судова-прававой рэформы ў Рэспубліцы Беларусь, прынятая Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 23 красавіка 1992 г., у сілу шэрагу прычын (аб'ектыўнага і суб'ектыўнага характару) не была рэалізавана на практыцы.





politring.com

## АСНОЎНЫЯ МЭТЫ / ЗАДАЧЫ РЭФОРМЫ

Мэтай судовай рэформы з'яўляецца стварэнне новай сістэмы судоў, якая можа забяспечыць якасны і аб'ектыўны разгляд спраў, а таксама гарантаваць абарону правоў і свабод грамадзян на ўсіх стадыях судаводства.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

**1.** на базе папярэдняй судовай сістэмы стварыць новую сістэму судоў;
**2.** забяспечыць рэальную незалежнасць судоў і суддзяў;
**3.** уключыць у працэс правасуддзя грамадзян як паўнапраўных суддзяў;
**4.** пашырыць сферу судовага кантролю;
**5.** развіць спецыялізацыю суддзяў;
**6.** узвысіць ролю Канстытуцыйнага суда;
**7.** забяспечыць самакіраванне суддзяў;
**8.** прыняць новае заканадаўства аб судовым ладзе і судаводстве;
**9.** ажыццявіць рэформу іншых праваахоўных органаў.

## КРОКІ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ РЭФОРМЫ

**1. Стварэнне новай судовай сістэмы.**
Новая судовая сістэма Рэспублікі Беларусь павінна складацца з судоў агульнай юрысдыкцыі, спецыялізаваных судоў і Канстытуцыйнага суда.
Суды агульнай юрысдыкцыі будуць уключаць у сябе: міжраённыя (акруговыя) суды; апеляцыйныя суды (абласныя (Мінскі гарадскі) суды); Вярхоўны суд. На тэрыторыі судовай акругі могуць стварацца ўчастковыя (міравыя) суды для разгляду малазначных спраў па спрошчанай працэдуры.
Міжраённыя (акруговыя) суды будуць ствараюцца ў адпаведнасці з падзелам тэрыторыі краіны на судовыя акругі з прыкладна роўнай колькасцю насельніцтва. Яны павінны быць прыкладна аднолькавымі па колькасці суддзяў (акрамя буйных гарадоў, дзе колькасць суддзяў можа быць вышэй з улікам іх нагрузкі).
Міжраённыя (акруговыя) суды павінны разглядаць справы па першай інстанцыі ў складзе аднаго суддзі; трох суддзяў; аднаго суддзі і калегіі з прысяжных засядацеляў.
Апеляцыйныя суды ва ўстаноўленым парадку павінны разглядаць скаргі бакоў (пратэсты пракурора) на рашэнні, пастановы і прысуды судоў першай інстанцыі, якія не ўступілі ў законную сілу.
Вярхоўны суд павінен на падставе наглядных скаргаў асуджаных і іх абаронцаў правяраць законнасць раней прынятых судовых рашэнняў.

**2. Забеспячэнне рэальнай незалежнасці судоў і суддзяў.**
Незалежнасць судоў і суддзяў можна забяспечыць шляхам абрання суддзяў на ўсіх узроўнях.
Па Канстытуцыі 1994 г. суддзі Канстытуцыйнага суда, Вярхоўнага суда, Вышэйшага гаспадарчага суда абіраліся на свае пасады Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь (п. 7 арт. 82). Гэты парадак трэба аднавіць, абмежаваўшы тэрмін абрання пяццю гадамі з правам перавыбрання суддзяў.
Такі ж парадак варта вызначыць і ў дачыненні да суддзяў ніжэйшых судоў. У якасці выбарнага органа могуць выступаць прадстаўнічыя органы мясцовага самакіравання рэгіёнаў. Тэрмін абрання для суддзяў ніжэйшых судоў можа складаць 4 гады.
У мэтах якаснага адбору кандыдатаў на пасады суддзяў варта прадугледзець падрыхтоўку кандыдатаў, уключаючы здачу кваліфікацыйнага экзамену, стажыроўку, сумоўе і ўключэнне ў Нацыянальны рэестр кандыдатаў на пасаду суддзяў Рэспублікі Беларусь. Далей кандыдаты з названага рэестра могуць прэтэндаваць на судовыя вакансіі па рэкамендацыі Рэспубліканскай Рады суддзяў.

**3. Уключэнне ў працэс правасуддзя грамадзян як паўнапраўных суддзяў.**
Прадугледзець па асобных катэгорыях крымінальных спраў стварэнне судоў з удзелам прысяжных засядацеляў (суддзяў ад народа). Умовай стварэння такога суда павінна з'яўляцца непрызнанне абвінавачаным сваёй віны ў здзяйсненні злачынства. Такі суд будзе складацца з суддзі і калегіі прысяжных засядацеляў.

**4. Пашырэнне сферы судовага кантролю.**
Менавіта судам даручаецца функцыя вырашэння пытання аб законнасці заключэння асоб пад варту, а таксама аб працягу тэрміну ўтрымання пад вартай. Суды, як гаранты абароны праў і свабод грамадзян, абавязаны прымаць да разгляду скаргі грамадзян на парушэнне іх праў і свабод з боку органаў дзяржаўнага кіравання і службовых асоб. Да сферы судовага кантролю павінны датычыцца і дзеянні (рашэнні) органаў папярэдняга расследавання.

**5. Паглыбленне спецыялізацыі суддзяў.**
У складзе міжраённых (акруговых) судоў прапануецца ўвесці пасады суддзяў па адміністрацыйных спрэчках (справах), па справах непаўнагадовых, па працоўных і сацыяльных спрэчках, іншых катэгорыях спраў.
Аднавіць суды па гаспадарчых справах. Гаспадарчыя суды закліка246ны разглядаць спрэчкі суб'ектаў гаспадарання (індывідуальных прадпрымальнікаў), справы аб банкруцтве суб'ектаў гаспадарання, скаргі суб'ектаў гаспадарання (індывідуальных прадпрымальнікаў) на рашэнні (дзеянні) органаў дзяржаўнага кіравання, пазвы органаў дзяржаўнага кіравання да суб'ектаў гаспадарання ў сувязі з іх незаконнай дзейнасцю.
Сістэма гаспадарчых судоў павінна складацца з Вышэйшага гаспадарчага суда, апеляцыйных судоў, гаспадарчых судоў рэгіёнаў. Для разгляду пэўных катэгорый гаспадарчых спраў могуць ствараецца спецыялізаваныя суды.

**6. Узмацненне ролі Канстытуцыйнага суда.**
Неабходна пашырыць яго паўнамоцтвы, а таксама павялічыць кола асоб, якія маюць права да яго звяртацца. У іх лік павінны ўваходзіць: Прэзідэнт, Старшыня Парламента, групы дэпутатаў у колькасці не менш за 30 чалавек, Урад, Вярхоўны суд, Вышэйшы гаспадарчы суд, Генеральны пракурор, Упаўнаважаны па правах чалавека, прадстаўнічыя органы рэгіёнаў, палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб'яднанні.
Грамадзяне Рэспублікі Беларусь таксама маюць права звяртацца ў Канстытуцыйны суд, калі іх правы і свабоды парушаюцца ў нарматыўных актах, якія былі выдадзены дзяржаўнымі органамі. Прадстаўляць інтарэсы грамадзяніна ў Канстытуцыйным судзе павінен адвакат або дыпламаваны юрыст.

**7. Забеспячэнне самакіравання суддзяў.**
У якасці органаў самакіравання могуць выступаць: З'езд суддзяў Рэспублікі Беларусь; Рэспубліканская Рада суддзяў; рэгіянальныя канферэнцыі суддзяў.
Пастаянна дзейным органам судзейскага сама-

кіравання павінна выступаць Рэспубліканская Рада суддзяў. Яе склад павінен фармавацца з’ездам суддзяў Рэспублікі Беларусь з улікам квот прадстаўніцтва.
Адной з важных функцый Рэспубліканскай Рады суддзяў павінна з’яўляцца рэкамендацыя кандыдатур на пасады суддзяў з ліку асоб, якія ўключаны ў Нацыянальны рэестр кандыдатаў на пасаду суддзі Рэспублікі Беларусь.

**8. Распрацоўка новага заканадаўства аб судовым ладзе і судаводстве.**
Прававой базай для распрацоўкі пакета законаў можа быць Канцэпцыя судова-прававой рэформы ў Рэспубліцы Беларусь, прынятая легітымным парламентам.
Асноватворным актам у гэтай сферы павінен стаць канстытуцыйны закон “Аб судовым ладзе ў Рэспубліцы Беларусь”. У ім павінны быць замацаваны задачы судоў, судовая сістэма, прынцыпы іх арганізацыі і дзейнасці, асновы прававога статусу суддзяў, пытанні забеспячэння дзейнасці судоў і органаў судзейскага самакіравання.

**9. Рэфармаванне іншых праваахоўных органаў.**
Судовая рэформа можа быць паспяховай пры ўмове мадэрнізацыі праваахоўных органаў. Гаворка ідзе аб органах дазнання, папярэдняга следства, пракуратуры, дзяржаўнай службы судовых экспертыз, арганізацыях адвакатаў. У сувязі з гэтым неабходна адначасова праводзіць рэформу судоў і праваахоўных органаў.



## ДАРОЖНАЯ КАРТА РЭФОРМЫ

1) Прыняцце пастановы Парламентам “Аб Канцэпцыі судова-прававой рэформы ў Рэспубліцы Беларусь”. У ім варта пазначыць мэты і задачы рэформы, асноўныя напрамкі і крокі па яе рэалізацыі, меры па пераўтварэнні судоў і іншых праваахоўных органаў.

2) Стварэнне камісіі, адказнай за рэалізацыю судова-прававой рэформы. У яе склад павінны ўвайсці дэпутаты парламента, кіраўнікі Канстытуцыйнага, Вярхоўнага, Вышэйшага гаспадарчага судоў, кіраўнікі профільных міністэрстваў і ведамстваў, вядомыя навукоўцы-юрысты. Старшынёй Камісіі па пасадзе можа быць міністр юстыцыі, а яго намеснікамі — адзін з дэпутатаў і навуковец-юрыст.

3) Прыняцце Дзяржаўнай праграмы па рэфармаванні судоў і праваахоўных органаў у Рэспубліцы Беларусь. У ёй варта вызначыць пералік законаў, неабходных для рэалізацыі палажэнняў судова-прававой рэформы з указаннем адказных асоб і тэрмінаў падрыхтоўкі. Пры гэтым неабходна прадугледзець выдзяленне датацый з бюджэту. У прыватнасці, павінна аплачвацца распрацоўка праектаў законаў, іх экспертыза ў навуковых і навучальных цэнтрах, запрашэнне замежных экспертаў.

4) Распрацоўка запланаваных законапраектаў і прыняцце іх парламентам краіны.

5) Ажыццяўленне новых законаў і здзяйсненне неабходных пераўтварэнняў.


mediazona.by

## ОРГАНЫ, ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЬ РАШЭННІ

Парламент.
Па Канстытуцыі 1994 г. такім парламентам з’яўляецца Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь. Ён павінен быць аднаўлены ў ходзе папярэдніх канстытуцыйных пераўтварэнняў.

## НАРМАТЫЎНЫЯ ПРАВАВЫЯ АКТЫ

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь “Аб Канцэпцыі судова-прававой рэформы ў Рэспубліцы Беларусь”.

Пастанова Вярхоўнага Савета і Урада Рэспублікі Беларусь “Аб зацвярджэнні персанальнага складу Камісіі па рэалізацыі Канцэпцыі судова-прававой рэформы ў Рэспубліцы Беларусь”.

Пастанова Вярхоўнага Савета і Урада Рэспублікі Беларусь “Аб Дзяржаўнай праграме па рэфармаванні судоў і праваахоўных органаў у Рэспубліцы Беларусь”.

***Законы Рэспублікі Беларусь:***

“Аб судовым ладзе ў Рэспубліцы Беларусь”;

“Аб парадку абскарджання ў суд дзеянняў і рашэнняў, якія парушаюць правы і свабоды грамадзян Рэспублікі Беларусь”;

“Аб парадку і ўмовах утрымання асоб пад вартай”;

“Аб перападпарадкаванні Дэпартамента выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь” (у склад Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь);

“Аб Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь”;

“Аб судах агульнай юрысдыкцыі ў Рэспубліцы Беларусь”;

“Аб судах па гаспадарчых справах у Рэспубліцы Беларусь”;

“Аб судах з удзелам прысяжных засядацеляў у Рэспубліцы Беларусь”;

“Аб судовых прыставах і судовых выканаўцах”;

“Аб пракуратуры ў Рэспубліцы Беларусь”;

“Аб адвакатуры ў Рэспубліцы Беларусь”;

“Аб натарыяце ў Рэспубліцы Беларусь”;

“Аб судова-экспертнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь”;

“Аб органах унутраных спраў у Рэспубліцы Беларусь”;

“Аб Службе нацыянальнай бяспекі ў Рэспубліцы Беларусь”.

# РЭФОРМА ПАРТЫЙНАЙ СІСТЭМЫ






*«Рэформа партыйнай сістэмы — гэта ключ да ўстойлівага развіцця палітычнай сістэмы дэмакратычнай дзяржавы, цывілізаваная змена ўлады праз свабодныя і справядлівыя выбары, магчымасць з'яўлення новых палітыкаў і рэальнае спаборніцтва паміж рознымі палітычнымі ідэалогіямі.»*

*Старшыня БСДП*
*Ігар Барысаў*

**Арганізацыя, адказная за распрацоўку праекта рэформы:**
Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада).

**Прапановы распрацаваны экспертамі:**
Ігарам БАРЫСАВЫМ,
Міхаілам ПАСТУХОВЫМ,
Аляксеем СІГАЕВЫМ.




## КАРОТКАЕ АПІСАННЕ

Рэформа будзе садзейнічаць павышэнню ўдзелу грамадзян у выбарах, а таксама ўплыву на выпрацоўку палітыкі на нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях. Прапануюцца меры па ўмацаванні фінансавай устойлівасці палітычных партый за кошт дзяржаўнай падтрымкі. Замацоўваюцца гарантыі доступу да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі, роўныя правы на ўдзел у выбарах у органы ўлады і на рэферэндумах, спрашчаецца працэдура рэгістрацыі новых палітычных арганізацый. Пашыраюцца магчымасці ўдзелу прадстаўнікоў партый і міжпартыйных аб’яднанняў у пасяджэннях дзяржаўных органаў.

Фармуецца аснова для дэмакратычнага транзіту ўлады, у тым ліку праз размежаванне палітыкі і бізнесу. Праводзіцца дэпалітызацыя і дэідэалагізацыя школы, каледжаў, універсітэтаў і працоўных калектываў. Палітычныя партыі надзяляюцца правам заканадаўчай ініцыятывы, а таксама правам звароту ў Канстытуцыйны суд. Здымаюцца абмежаванні пры правядзенні масавых мерапрыемстваў і адмяняецца аплата паслуг дзяржслужбаў пры іх правядзенні.




## ПРАБЛЕМЫ, НА РАШЭННЕ ЯКІХ НАКІРАВАНА РЭФОРМА

**1. Празмерная забюракратызаванасць, складанасць і працаёмкасць працэдуры рэгістрацыі палітычных партый і міжпартыйных аб'яднанняў.**
Для стварэння партыі патрабуецца не менш за 1000 заснавальнікаў ад большасці абласцей і г. Мінска, а таксама дэталёвыя формы ўліку асабістых даных (хатні і працоўны тэлефоны). Гэта стварае магчымасці для ўмяшання ў асабістае жыццё грамадзян і ціску з боку органаў улады і працадаўцаў.

**2. Дыскрымінацыйная палітыка ў дачыненні да апазіцыйных партый.**
Гэта пацвярджаецца тым, што ў партый узнікаюць цяжкасці пры атрыманні юрыдычнага адрасу і пры арэндзе памяшканняў, у тым ліку для правядзення статутных з'ездаў і мерапрыемстваў, неўключэннем сябраў палітычных партый у склад выбарчых камісій.

**3. Абмежаваны доступ да дзяржаўных СМІ, уключаючы тэлебачанне і радыё.**
Партыі могуць трапіць на старонкі дзяржаўных газет і тэлебачанне толькі падчас выбараў. Гэта прадугледжваецца бясплатнай падтрымкай дзяржавай кандыдатаў у дэпутаты парламента і прэзідэнты.
У дзяржСМІ часцяком даецца ангажаваная і тэндэнцыйная інфармацыя, без альтэрнатыўнага меркавання і каментарыяў з боку прадстаўнікоў партый.

**4. Адсутнасць дзяржаўнага фінансавання і перашкоды з боку ўладаў па атрыманні падтрымкі з боку бізнесу і грамадзян.**
З-за пагроз улад апазіцыйныя партыі практычна не атрымліваюць ахвяраванняў ад прыватных фірмаў, прадпрымальнікаў, дзяржаўных прадпрыемстваў або грамадзян.

**5. Карныя нормы беларускага заканадаўства па ліквідацыі партый.**
Нормы заканадаўства разлічаныя на хуткую і фармальную ліквідацыю непажаданых партый, што стварае магчымасці для адвольнай расправы з арганізацыямі.



## АСНОЎНЫЯ МЭТЫ / ЗАДАЧЫ РЭФОРМЫ

Мэтай рэформы з'яўляецца ўмацаванне статусу палітычных партый, міжпартыйных аб'яднанняў у жыцці дзяржавы і грамадства, а таксама ўзмацненне іх ролі ў выбарных органах улады.

1. Спрашчэнне рэгістрацыі палітычных партый і пастаноўкі на ўлік іх арганізацыйных структур.
2. Забеспячэнне фінансавання парламенцкіх партый за кошт дзяржаўнага бюджэту.
3. Прадастаўленне роўнага і рэгулярнага доступу партый і міжпартыйных аб'яднанняў да дзяржаўных СМІ.
4. Абмежаванне мер па ліквідацыі партый і міжпартыйных аб'яднанняў, якія маюць адвольны ці карны характар.
5. Павышэнне ролі партый у выбарных органах за кошт увядзення прапарцыйна-мажарытарнай сістэмы выбараў у парламент і мясцовыя Саветы дэпутатаў.
6. Узмацненне ролі партый і міжпартыйных аб'яднанняў па забеспячэнні празрыстасці выбарчага працэсу.
7. Дэпалітызацыя і дэідэалагізацыя школ, каледжаў, універсітэтаў і працоўных калектываў.
8. Надзяленне палітычных партый правам заканадаўчай ініцыятывы і звароту ў Канстытуцыйны суд.
9. Лібералізацыя патрабаванняў да правядзення масавых мерапрыемстваў партыямі.

## КРОКІ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ РЭФОРМЫ

**1. Паменшыць колькасць заснавальнікаў (членаў) палітычных партый да 500 чалавек.**
Практыка стварэння і дзейнасці палітычных партый у Беларусі паказала, што 1000 заснавальнікаў — гэта занадта вялікая колькасць.

**2. Абавязаць органы мясцовага кіравання і самакіравання садзейнічаць заснавальнікам у даванні памяшканняў** з фонду камунальнай уласнасці па месцы правядзення ўстаноўчых з'ездаў і іншых статутных мерапрыемстваў.

**3. Выкарыстоўваць "кантактны тэлефон" пры рэгістрацыі палітычных партый і міжпартыйных аб'яднанняў.**
Выключыць магчымасць аказання ціску на заснавальнікаў у працэсе рэгістрацыі партыі з боку органаў улады, а таксама ўварвання ў асабістае жыццё.

**4. Падзяліць працэдуры дзяржаўнай рэгістрацыі палітычных партый і пастаноўкі на ўлік арганізацыйных структур партыі.**
Стварэнне і пастаноўка на ўлік арганізацыйных структур партыі з'яўляецца справай самой партыі. Сыходзячы з гэтага, мясцовыя ўпраўленні юстыцыі абавязаны паставіць іх на ўлік пры наяўнасці неабходных дакументаў.

**5. Забараніць стварэнне і дзейнасць палітычных партый, міжпартыйных аб'яднанняў, якія маюць на мэце гвалтоўнае змяненне канстытуцыйнага ладу ці вядуць прапаганду вайны, сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасці.**

**6. Прадугледзець магчымасць удзелу партый і міжпартыйных аб'яднанняў у арганізацыі і правядзенні рэферэндумаў як на нацыянальным, так і на мясцовым узроўнях.**

**7. Дапоўніць спіс асоб, якія не могуць быць членамі палітычных партый, супрацоўнікамі Следчага камітэта.**

**8. Выключыць магчымасць умяшання ў справы партый і міжпартыйных аб'яднанняў з боку Прэзідэнта.**
Вызначэнне назвы палітычнай партыі можа рабіць толькі рэгіструючы орган па ўзгадненні з заснавальнікамі.

**9. Прадугледзець пастаяннае прамое фінансаванне палітычных партый з дзяржбюджэту.**
Дзяржаве неабходна даваць бюджэтныя датацыі партыям за дзейнасць у межах заканадаўства і статутных дакументаў. Паказчыкам гэтага з'яўляецца ўдзел у выбарах.

**10. Забяспечыць роўны і пастаянны доступ партый і міжпартыйных аб'яднанняў да дзяржаўных СМІ.**
Неабходна скласці спіс грамадска-палітычных праграм на дзяржаўных тэле- і радыёканалах з выдзяленнем прадстаўнікам апазіцыі ў гэтых перадачах не менш за 25% эфірнага часу.

**11. Увесці адказнасць партый і міжпартыйных аб'яднанняў за сістэматычнае (а не аднаразовае) парушэнне заканадаўства на працягу пэўнага перыяду часу.**

**12. Замацаваць гарантаванае права партый у фармаванні выбарчых камісій з ліку сваіх прадстаўнікоў.**
У складзе выбаркамаў можа быць не больш за аднаго прадстаўніка ад кожнай палітычнай партыі. Замацаваць магчымасць прысутнасці на пасяджэнні органаў, якія ўтвараюць камісіі, прадстаўнікоў партый, а таксама знаёміцца з дакументамі аб вылучэнні ў выбаркамы.

**13. Увесці змяшаную (прапарцыйна-мажарытарную) сістэму па выбарах у парламент з трохпрацэнтным выбарчым бар'ерам.**
Склад парламента і мясцовых Саветаў дэпутатаў дазволіць адэкватна адлюстроўваць палітычныя перавагі грамадства і будзе прадстаўляць інтарэсы значных груп насельніцтва.

**14. Скасаваць вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты і членаў выбаркамаў працоўнымі калектывамі.**

**15. Ліквідаваць пасады ідэолагаў у працоўных калектывах, школах, каледжах і ўніверсітэтах.**

**16. Надзяліць партыі правам заканадаўчай ініцыятывы і звароту ў Канстытуцыйны суд.**
Пры праве заканадаўчай ініцыятывы распрацаваныя законапраекты з'яўляюцца абавязковымі для ўнясення ў парадак дня і разгляду парламентам незалежна ад таго, ці прадстаўлена партыя ў парламенце. Палітычная партыя зможа накіроўваць звароты ў Канстытуцыйны суд і па прынятых парламентам законах.

**17. Увесці паведамляльны прынцып правядзення масавых мерапрыемстваў партыямі і адмяніць аплату паслуг міліцыі, хуткай дапамогі і камунальнай службы.**
Апавяшчэнне аб мерапрыемстве, якое мае адбыцца, павінна накіроўвацца ў мясцовы выканкам не пазней чым за дзень да яго правядзення. Мясцовыя органы ўлады павінны забяспечыць бяспеку мерапрыемства, якое мае адбыцца. Паслугі міліцыі, медыкаў і камунальных службаў ужо аплачаны за кошт падаткаў грамадзян. Камерцыялізацыя гэтых пытанняў не дапускаецца.




TUT.BY

## ОРГАНЫ, ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЬ РАШЭННІ

Парламент,
Савет Міністраў,
Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

## НАРМАТЫЎНЫЯ ПРАВАВЫЯ АКТЫ

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь ад 15 сакавіка 1994 г.

Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 11 лютага 2000 г. № 370-З.

Жыллёвы кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 28 жніўня 2012 г. № 428-З.

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 кастрычніка 1994 г. № 3266-XII “Аб палітычных партыях”.

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 1997 г. № 114-З “Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь”.

Пастанова Савета Міністраў ад 24 студзеня 2019 г. № 49 “Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку аплаты паслуг па ахове грамадскага парадку, якія аказваюцца органамі ўнутраных спраў, расходаў, звязаных з медыцынскім абслугоўваннем, прыборкай тэрыторыі пасля правядзення на ёй масавага мерапрыемства”.

# РЭФОРМА СІСТЭМЫ ПРАЦОЎНЫХ І ЗВЯЗАНЫХ З ІМІ АДНОСІН




*“Беларуская мадэль сацыяльнай дзяржавы толькі звонку выглядае прывабнай, але, насамрэч, у Беларусі пабудавана сістэма дзяржаўнага капіталізму, дзе правы працоўных сістэмна парушаюцца, няма асноўных правоў і свабод, якія гарантаваны Канстытуцыяй і Канвенцыямі Міжнароднай арганізацыі працы.*
*Пры змене формы палітычнай сістэмы мы павінны паклапаціцца, каб працоўны чалавек не адчуваў сябе прыгонным, мог бараніць свае правы, у тым ліку праз незалежныя ад дзяржавы і наймальнікаў прафсаюзы.*
*Павінны быць адменены заканадаўчыя акты, што не адпавядаюць міжнародным стандартам, робяць працу чалавека неадпаведнай чалавечай годнасці і патрэбам годнага жыцця.”*



*Старшыня БКДП*
*Аляксандр Ярашук*

**Арганізацыя, адказная за распрацоўку праекта рэформы:**
Беларускі кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў.

**Прапановы распрацаваны экспертамі:**
Аленай ЯСЬКОВАЙ і Сяргеем АНТУСЕВІЧАМ.

## КАРОТКАЕ АПІСАННЕ

Асноўнай праблемай у сферы працоўных адносін з’яўляецца беспрэцэдэнтны ўзровень дзяржаўнага ўмяшання (у прыватнасці, Прэзідэнта краіны праз выданне Дэкрэтаў №№ 3, 5, 29 і інш.) у сферу рэгулявання сацыяльна-працоўных адносін, кантрактная сістэма найму, жорсткасць нормаў працоўнага заканадаўства. Немагчымасць правядзення законнай забастоўкі зніжае здольнасці работнікаў да абароны сваіх правоў і інтарэсаў, пазбаўляе іх магчымасці свабоднага аб’яднання ў прафсаюзы.

Незалежныя прафсаюзы падтрымліваюць сфармуляваную Міжнароднай арганізацыяй працы (МАП) Канцэпцыю годнай працы, дзе годная праца выступае ў якасці стрыжня сацыяльнага, эканамічнага і экалагічнага развіцця, грае галоўную ролю ў справе забеспячэння сацыяльнай справядлівасці, абароненасці работнікаў, недапушчэння іх эксплуатацыі, прызнанне каштоўнасці наёмнай працы і яе непасрэднага выканаўцу — чалавека.



## ПРАБЛЕМЫ, НА РАШЭННЕ ЯКІХ НАКІРАВАНА РЭФОРМА

Рэформа накіравана на ліквідацыю наступстваў сацыяльна-эканамічнай палітыкі апошніх дзесяцігоддзяў, дзе сталі магчымымі дыскрымінацыйныя заканадаўчыя акты ў сферы працоўных адносін, пазбаўленне працоўных правоў на абарону сваіх інтарэсаў, а таксама празмерны ўплыў дзяржавы на ўзровень заработнай платы і абмежаванне яе росту, злоўжыванне сістэмай кароткатэрміновых працоўных кантрактаў, дыскрымінацыя на працоўным месцы па пытанні прыналежнасці да прафсаюзаў, пазбаўленне гарантаваных раней дзяржавай сацыяльных выплат і льгот.




Улад Барысевіч, onliner.by

## АСНОЎНЫЯ МЭТЫ / ЗАДАЧЫ РЭФОРМЫ

Асноўнай мэтай рэформы з'яўляецца вяртанне краіны на шлях выканання міжнародных стандартаў у сферы працы. Правядзенне палітыкі недыскрымінацыі па прыкметах прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай, палітычнай і гендарнай групы.

## КРОКІ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ РЭФОРМЫ

**1. Стварэнне працоўных месцаў.**
У мэтах фармавання структурна развітай, канкурэнтаздольнай эканомікі неабходна распрацаваць нацыянальную праграму па стварэнні якасных працоўных месцаў для задавальнення запытаў на працу ўсяго працаздольнага насельніцтва і запатрабаванасці моладзі на рынку працы.

**2. Вытворчасць працы.**
Забяспечыць, паводле рэкамендацый МАП, "сумленны" шлях павышэння прадукцыйнасці працы, пры якім яна расце за кошт паляпшэння ўмоў працы, мадэрнізацыі сродкаў вытворчасці і праграмы прафесійнай падрыхтоўкі работнікаў, паляпшэння вытворчага асяроддзя і поўнага захавання працоўных правоў, выключаючы "несумленны" шлях, які прадугледжвае эксплуатацыю працоўнай сілы.

**3. Гарантыі працоўных правоў работнікаў.**
Правядзенне комплекснага ўдасканалення заканадаўства ў сацыяльна-працоўнай сферы з захаваннем наступных прынцыпаў:
- прыярытэту агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права ў адносінах да нацыянальнага заканадаўства, канстытуцыйнасці і законнасці;
- прынцыпу вяршэнства нормаў Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь у дачыненні да супярэчных яму нормаў іншых заканадаўчых актаў у частцы рэгулявання працоўных і звязаных з імі адносін;
- абароны правоў і свабод, законных інтарэсаў грамадзян;
- сацыяльнай справядлівасці;
- уліку меркавання сацыяльных партнёраў на стадыях распрацоўкі і абмеркавання праектаў законаў у сацыяльна-працоўнай сферы.

**4. Гендарная роўнасць.**
У мэтах дасягнення гендарнай роўнасці ў сацыяльна-працоўных адносінах абавязаць наймальнікаў (службовыя асобы арганізацыі незалежна ад яе статусу і формы ўласнасці або фізічныя асобы, якія валодаюць правам прыёму на працу):
- забяспечваць роўныя магчымасці, ужываць раўнацэнныя крытэрыі адбору для жанчын і мужчын пры найме на працу і роўны доступ жанчын і мужчын да вакантных працоўных месцаў;
- за раўнацэнную працу выплачваць жанчынам і мужчынам роўную заработную плату, уключаючы ўсе дадатковыя выплаты;
- забяспечваць роўныя магчымасці для павышэння кваліфікацыі, набыцця практычнага працоўнага вопыту, ажыццяўлення перападрыхтоўкі, прасоўвання па службе;
- арганізаваць меры, якія забяспечваюць неўмяшання ў прыватнае жыццё і павагу асабістай годнасці работнікаў абодвух полаў, а таксама якія выключаюць сексуальныя дамаганні;
- у выпадку масавага звальнення работнікаў улічваць суадносіны колькасці жанчын і мужчын у гэтай арганізацыі, не дапускаючы дыскрымінацыі аднаго з полаў;
- забяспечваць жанчынам і мужчынам роўныя ўмовы і магчымасці па сумяшчэнні прафесійных і сямейных абавязкаў.

**5. Годная зарплата — асноўны індыкатар годнай працы.**
Прыняць меры для ліквідацыі супярэчнасцяў у сферы заработнай платы, якія выяўляюцца ў рэзкай дыферэнцыяцыі заработнай платы і вельмі недастатковым узроўні сярэдняй заработнай платы, што адказвае панаццю справядлівага размеркавання вынікаў працы.
Забяспечыць паэтапнае ўстанаўленне на прадпрыемствах прамысловасці пагадзіннай формы аплаты працы і выключэнне здзельнай формы аплаты працы.

**6. Ахова працы.**
Аналіз умоў працы і прафесійных захворванняў сведчыць, што практычна ва ўсіх галінах эканомікі адзначаецца неадпаведнасць працоўных месцаў санітарна-гігіенічным патрабаванням, і захоўваюцца неспрыяльныя ўмовы працы, што цягне за сабой пагаршэнне стану здароўя працуючых, выяўленне новых выпадкаў прафесійных захворванняў на вытворчасці і страту працаздольнасці. Неабходна правядзенне комплекснай гігіенічнай ацэнкі ўмоў працы на ўсіх прадпрыемствах і прыняцце адпаведных мер па прывядзенні ўмоў працы да гігіенічных нарматываў.

**7. Сацыяльная абарона беспрацоўных.**
У Рэспубліцы Беларусь павінна быць распрацавана перспектыўная сістэма поўнай і прадуктыўнай занятасці, сацыяльнай абароны беспрацоўных на аснове прыярытэту агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права.
У мэтах сацыяльнай абароны беспрацоўных грамадзян, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, неабходна:
- падвысіць мінімальны памер дапамогі па беспрацоўі да ўзроўню мінімальнага спажывецкага бюджэту на душу насельніцтва за кошт сродкаў дзяржбюджэту без павелічэння падатковай нагрузкі на работнікаў і арганізацыі;
- максімальны памер дапамогі па беспрацоўі грамадзянам усталёўваць у працэнтных адносінах да сярэдняга заробку, вылічанага за тры апошнія месяцы па апошнім месцы працы, але не ніжэй за 50% страчанага заробку;
- выплачваць дапамогі па беспрацоўі грамадзянам, звольненым па любых падставах;
- выплачваць дапамогі па беспрацоўі часткова беспрацоўным грамадзянам, занятым няпоўны працоўны час;
- грамадзянам, звольненым па заканчэнні тэр-

мінаў кантрактаў, у сувязі з нязгодай са зменай істотных умоў працы, выплачваць 100% дапамогі па беспрацоўі.

**8. Сацыяльныя гарантыі. Пенсійнае забеспячэнне.**

Прыняць меры, накіраваныя на забеспячэнне суадносін індывідуальнай пенсіі па ўзросце і заработнай платы работнікаў да ўзроўню не менш за 50%, але не ніжэй мінімальнага пражытковага бюджэту (МПБ), а для працуючых у шкодных і небяспечных умовах працы — не ніжэй за 60-70%.

Прыняць меры з тым, каб знізіць да 10 гадоў страхавы стаж, які дае права на прызначэнне працоўнай пенсіі.

Аднавіць перыяды, выключаныя са страхавога стажу (перыяд знаходжання ў адпачынку па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3-х гадоў, перыяд догляду інваліда I-й групы або дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, падчас атрымання прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, адукацыі пасля ВНУ, перыяды атрымання дапамогі па беспрацоўі).

Адмяніць нарматыўныя абмежаванні памераў прызначаных пенсій і ўраўняльныя пенсійныя выплаты.

**9. Сацыяльнае партнёрства.**

Правесці, згодна рэкамендацыі камісіі па расследаванні МАП, усебаковы агляд калектыўных працоўных адносін з мэтай забеспячэння дакладнага размежавання паміж роляй урада і ролямі сацыяльных партнёраў і аказання садзейнічання развіццю цалкам незалежных арганізацый працоўных.



## ОРГАНЫ, ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЬ РАШЭННІ

Прэзідэнт,
Парламент,
Савет Міністраў.




## НАРМАТЫЎНЫЯ ПРАВАВЫЯ АКТЫ

***Змена:***
Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 26.07.1999 г. № 296-З (рэд. ад 18.07.2019 г.).

***Адмена:***
Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 1999 г. № 29 “Аб дадатковых мерах па ўдасканаленні працоўных адносін, умацаванні працоўнай і выканаўчай дысцыпліны”.

Дэкрэт Прэзідэнта № 5 “Аб узмацненні патрабаванняў да кіруючых кадраў і работнікаў арганізацый”.

Дэкрэт № 3 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва”.

Палажэнне аб парадку аднясення тэрыторый да тэрыторый з напружанай сітуацыяй на рынку працы, зацверджанае пастановай Савета Міністраў ад 22.02.2018 г. № 142.

Прагнозныя паказчыкі ў галіне садзейнічання занятасці насельніцтва і іх паквартальныя значэнні на 2018 г., зацверджаныя пастановай Савета Міністраў ад 26.02.2018 г. № 154.

Палажэнне аб парадку аднясення працаздольных грамадзян да незанятых у эканоміцы, фармавання і вядзення базы даных працаздольных грамадзян, якія незанятыя ў эканоміцы, уключаючы ўзаемадзеянне ў гэтых мэтах дзяржаўных органаў і арганізацый, зацверджанае пастановай Савета Міністраў ад 31.03.2018 г. № 239.

Прыкладнае палажэнне аб пастаянна дзейнай камісіі па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва, зацверджанае пастановай Савета Міністраў ад 31.03.2018 г. № 240.

Пералік паслуг, якія даюцца працаздольным грамадзянам, незанятым у эканоміцы, па цэнах (тарыфах), што забяспечваюць поўную кампенсацыю эканамічна абгрунтаваных затрат на іх аказанне, а таксама ўмовы іх выдзялення, зацверджаны пастановай Савета Міністраў ад 24.04.2018 г. № 314.

Змены ў парадак разлікаў і ўнясення платы за жыллёва-камунальныя паслугі, зацверджаныя пастановай Савета Міністраў ад 24.04.2018 г. № 315.

Пункты 1 і 2 Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31.07.2014 г. № 744 “Аб аплаце працы работнікаў”.

Указ № 137 “Аб удасканаленні пенсійнага забеспячэння”.

Закон “Аб прафесійным пенсійным страхаванні”.

Дэкрэт Прэзідэнта № 2 “Аб некаторых мерах па ўпарадкаванні дзейнасці палітычных партый, грамадскіх арганізацый і прафесійных саюзаў”.

Пастанова Міністэрства юстыцыі № 48 ад 30.08.2005 г.

***Ратыфікацыя:***

Канвенцыя № 102 МАП “Аб мінімальных нормах сацыяльнага забеспячэння”.

Канвенцыя № 131 МАП “Аб устанаўленні мінімальнай заработнай платы з асаблівым улікам краін, якія развіваюцца”.

Канвенцыя № 158 МАП “Аб спыненні працоўных адносін па ініцыятыве працадаўцы”.

# РЭФОРМА ЭНЕРГЕТЫЧНАГА СЕКТАРА



be.wikipedia.org



*“Змены клімату і негатыўныя экалагічныя і эканамічныя наступствы развіцця энергетыкі па традыцыйным шляху ставяць пытанне аб страце энергетычнай незалежнасці Беларусі.*
*Рэформа ў энергетыцы, пераход да аднаўляльных крыніц энергіі — гэта рашэнне можа вырашыць праблемы выкідаў парніковых газаў, даць імпульс развіццю зялёнай эканоміцы і атрымаць сапраўдную незалежнасць.”*

*Старшыня БП “Зялёныя”*
*Дзмітрый Кучук*

**Арганізацыя, адказная за распрацоўку праекта рэформы:**
Беларуская партыя “Зялёныя”.

**Прапановы распрацаваны экспертамі:**
Кацярынай ЛАППО і Дзмітрыем КУЧУКОМ.



vmeste.seversta.com

## КАРОТКАЕ АПІСАННЕ

Актуальнасць рэфармавання Нацыянальнага энергетычнага сектара абумоўлена неабходнасцю забяспечыць энергетычную бяспеку краіны, імклівымі зменамі клімату, негатыўнымі эканамічнымі і экалагічнымі наступствамі выкарыстання традыцыйных крыніц энергіі.

Рэформа прадугледжвае рашучыя меры, накіраваныя на энергазабеспячэнне пераважна за кошт аднаўляльных крыніц энергіі (АКЭ), скарачэнне залежнасці Беларусі ад імпартнага газу, дэцэнтралізацыю энергазабеспячэння, а таксама намаганні, накіраваныя на поўнае выкарыстанне вялікага патэнцыялу павышэння энергаэфектыўнасці пры дапамозе найлепшых даступных тэхналогій. Прапануецца комплексны падыход, уключаючы працу з паводзінскімі ўстаноўкамі энергаспажывання. У выніку ўкаранення стратэгій і планаў змяняюцца і паводзіны людзей.




## ПРАБЛЕМЫ, НА РАШЭННЕ ЯКІХ НАКІРАВАНА РЭФОРМА

Сёння вызначальным фактарам для энергетычнай сістэмы Беларусі з'яўляецца высокая залежнасць ад знешніх энергетычных рэсурсаў: амаль 90% паліва, якое выкарыстоўваецца ў энергетычным сектары, імпартуецца з Расійскай Федэрацыі. Такая высокая залежнасць становіцца прычынай шэрагу сур'ёзных праблем і робіць энергетычны сектар вельмі ўразлівым да любых зменаў на газавым рынку.

Павышэнне коштаў на імпартаваны газ з Расійскай Федэрацыі прыводзіць да павышэння ўнутраных цэн на газ і тарыфаў на электраэнергію ў Беларусі. Акрамя таго, частка абсталявання ў беларускай энергасістэме тэхналагічна састарэла і выпрацавала свой праектны рэсурс, патрабуе мадэрнізацыі або замены на сучасныя тэхналагічныя рашэнні. Таму асноўнай мэтай паэтапнага рэфармавання энергетычнага сектара Беларусі павінна стаць скарачэнне аб'ёмаў выкарыстання выкапнёвых відаў паліва і памяншэнне залежнасці ад імпартуемых рэсурсаў.

Усё больш урадаў, навукоўцаў, інстытутаў грамадзянскай супольнасці разглядаюць пераход ад існуючай энергетычнай сістэмы на аснове выкарыстання выкапнёвага і ядзернага паліва да сістэмы, заснаванай пераважна на выкарыстанні аднаўляльных крыніц энергіі (АКЭ). Такі пераход стабілізуе сітуацыю з выкідамі парніковых газаў, надасць дадатковыя імпульсы эканамічнаму росту, дапаможа вырашыць лакальныя праблемы, звязаныя з забруджваннем паветра, і ў будучыні забяспечыць краіне і рэгіёнам энергетычную незалежнасць.

Апошнія гады ў сектары аднаўляльнай энергетыкі назіраецца ўстойлівае зніжэнне коштаў на сонечныя, ветравыя і іншыя тэхналогіі, таму і агульнасусветнай тэндэнцыяй з'яўляецца стабільны рост долі аднаўляльных крыніц энергіі. У лістападзе 2015 г. Беларусь далучылася да Парыжскай дамовы аб змяненні клімату (ратыфікавала яе ў верасні 2016 г.). Заяўленая ў нацыянальна вызначаных абавязацельствах краіны мэта — забяспечыць да 2030 г. скарачэнне выкідаў парніковых газаў не менш чым на 28% ад узроўню выкідаў 1990 г.

Гэтыя абавязацельствы Беларусі абапіраюцца толькі на ўнутраны патэнцыял краіны і прымаюцца без якіх-небудзь дадатковых умоў (гэта значыць, абавязацельства не прадугледжвае выкарыстанне механізмаў міжнароднага вугляроднага рынку і прыцягненне замежных фінансавых рэсурсаў для ўкаранення найлепшых даступных тэхналогій). Такія высокія паказчыкі мэты грунтуюцца, у асноўным, на планах па ўвядзенні ў эксплуатацыю Беларускай АЭС і далейшых мерах па зніжэнні вугляродаёмістасці эканомікі, але практычна не абапіраюцца на далейшае развіццё аднаўляльных крыніц энергіі (мэта Беларусі па ўкараненні АКЭ — 8% да 2030 г. і 9% да 2035 г.).

У канцэпцыі энергетычнай бяспекі Беларусі, прынятай у канцы 2015 г., таксама пазначана, што ўзровень залежнасці ад знешніх пастаўшчыкоў застаецца крытычным, і ўстанаўліваюцца канкрэтныя мэты па зніжэнні залежнасці ад паставак з-за мяжы (да 2035 г. доля Расійскай Федэрацыі ў імпарце энергарэсурсаў павінна быць зніжана на 20%, з 90% да 70%). І ў гэтай стратэгіі ключавым момантам з'яўляецца тое, што газ будзе замяшчацца энергіяй Беларускай АЭС, паліва для якой плануецца закупляць у той жа Расійскай Федэрацыі.

Прычым гэтая залежнасць стане яшчэ мацней, таму што замяніць пастаўшчыка будзе амаль немагчыма. Усё гэта дазваляе казаць пра тое, што стратэгія беларускага ўрада не здольная забяспечыць рэальныя змены ў энергетычнай бяспецы Беларусі і, па сутнасці, захоўвае статус-кво ў залежнасці ад Расійскай Федэрацыі, замяняючы толькі віды імпартаванага паліва.

У Беларусі забяспечана магчымасць валодання аб'ектамі АКЭ для замежных інвестараў (пры гэтым дзяржава гарантуе набыццё энергіі). Аднак канчатковы спажывец мае магчымасць купляць электраэнергію толькі цэнтралізавана праз дзяржаўнага рэгулятара, не маючы магчымасці закупляць энергію, атрыманую з аднаўляльных крыніц, непасрэдна ў прыватнага вытворцы.

Адметнай асаблівасцю рэгулявання сектара аднаўляльнай энергетыкі ў Беларусі з'яўляецца выкарыстанне механізма кватавання стварэння ўстановак, якія выкарыстоўваюць аднаўляльныя крыніцы энергіі. Ён стаў рэакцыяй на высокія тэмпы развіцця АКЭ ва ўмовах наяўнасці падвышальных каэфіцыентаў і абавязковага выкупу дзяржавай атрыманай энергіі пры недахопе бюджэтных сродкаў, прызначаных для гэтых мэт.

У адпаведнасці з дзейным у Беларусі механізмам, колькасць інвестараў і аб'ёмы будаўніцтва новых установак абмежаваныя (акрамя ўстановак, якія выкарыстоўваюцца толькі для гаспадарчай дзейнасці, але не для продажу атрыманай энергіі), у той час як наяўнасць падвышальных каэфіцыентаў для інвестараў, якім удалося атрымаць квоту, гарантаваная на працягу 10 гадоў пасля ўводу ўстаноўкі ў эксплуатацыю.

На гэты момант колькасць заявак на выдзяленне квот на будаўніцтва ўстановак, якія выкарыстоўваюць АКЭ, у разы перавышае ўстаноўленыя дзяржавай аб'ёмы. Механізм кватавання (як і наяўнасць павышаючых каэфіцыентаў) неаднаразова падвяргаўся крытыцы ў тым ліку з боку дзяржаўных органаў у Рэспубліцы Беларусь як неэфектыўны і зводзячы тэмпы развіцця галіны да мінімуму.

У гарадскіх і ў нацыянальных стратэгічных дакументах няма выразна зафіксаваных прыярытэтаў развіцця транспартнага сектара. Пры гэтым транспартны сектар Беларусі расходуе каля 24% ад усёй энергіі, якая спажываецца ў краіне. У цэлым жа, у Беларусі ўжо прымаюцца пэўныя меры для дзяржаўнага стымулявання сектара аднаўляльнай энергіі і павышэння энергаэфектыўнасці. Але пры гэтым патэнцыял высокатэхналагічнага росту сектара сучаснай аднаўляльнай энергетыкі ў краіне застаецца вельмі вялікім, што разам з глыбінным аналізам станоўчых тэндэнцый развіцця і сусветнага вопыту ўкаранення АКЭ дазваляе казаць пра магчымасці ставіць больш амбіцыйныя мэты ўжо да 2025 г.





## АСНОЎНЫЯ МЭТЫ / ЗАДАЧЫ РЭФОРМЫ

1. Паменшыць залежнасць ад імпартаваных рэсурсаў.
2. Скараціць аб'ёмы выкарыстання выкапнёвых відаў паліва.
3. Скараціць выкіды парніковых газаў.
4. Максімальна выкарыстоўваць патэнцыял павышэння энергаэфектыўнасці.
5. Знізіць рост выдаткаў на размеркаванне і транспарціроўку электрычнай энергіі і паліва, а таксама страт, якія пры гэтым узнікаюць.
6. Знізіць энергаспажыванне, змяніць паводзінскія мадэлі спажывання.
7. Забяспечыць энергетычную незалежнасць.
8. Захаваць здароўе насельніцтва і якасць жыцця шляхам запаволь вання росту забруджвання навакольнага асяроддзя.
9. Знізіць негатыўны ўплыў транспартнага сектара на здароўе жыхароў гарадоў.
10. Стымуляваць эканамічнае развіццё, звязанае з пашырэннем існуючых і з'яўленнем новых рынкаў і бізнес-мадэляў.
11. Стварыць актуальныя кампетэнцыі і новыя працоўныя месцы.



## КРОКІ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ РЭФОРМЫ

Рэформа прадугледжвае максімальнае выкарыстанне патэнцыялу павышэння энергаэфектыўнасці і справядлівае размеркаванне энергетычных рэсурсаў.
Пры гэтым неабходна ставіць амбіцыйныя, але рэалістычныя мэты максімальнага выкарыстання патэнцыялу павышэння энергаэфектыўнасці. Скарачэнне энергаспажывання досыць раўнамерна размяркоўваецца прамысловасцю, транспартным і бытавым ці камерцыйным сектарамі.
У аснове гэтага падыходу ляжыць рацыянальнае выкарыстанне, але не поўная адмова ад выкарыстання энергіі. У яго аснове наступныя меры:

**1. Паляпшэнне цеплаізаляцыі і праектавання будынкаў.** Будынкі энергаэфектыўнай архітэктуры тэхналогіі "пасіўны дом" маюць практычна нулявыя выкіды вугляроду. Прычым найбольшы эфект можа быць дасягнуты не за кошт будаўніцтва новых будынкаў, а за кошт мадэрнізацыі існуючых. У гэтым напрамку ўрад павінен паскорыць тэмпы мадэрнізацыі існуючага жылога фонду. Пры гэтым такая мадэрнізацыя ўсіх будынкаў павінна быць максімальнай, улічваючы доўгі тэрмін іх эксплуатацыі.
Электрапрыборы, вытворчыя працэсы, ацяпленне і ахалоджванне вытворчых будынкаў, а таксама ўсе віды транспартных тэхналогій утрымліваюць істотны патэнцыял энергаэфектыўнасці. Новыя тэхналогіі будуць укараняцца ва ўсіх сектарах у межах звычайных тэмпаў замяшчэння.

**2. Дэцэнтралізаваныя крыніцы энергіі і маштабнае выкарыстанне АКЭ.** Такія крыніцы інтэграваныя ў сістэму мясцовай размеркавальнай сеткі, да якой падлучаны дамы, офісы, а таксама малыя прадпрыемствы. Мы прапануем выкарыстоўваць размеркаваную энергію — энергію, якая выпрацоўваецца ў месцы спажывання або побач з месцам спажывання. Размеркаваная вытворчасць энергіі — гэта электрастанцыі, падлучаныя да нізкавольтных і сярэдневольтных ліній электраперадач з сярэдняй адлегласцю перадачы ад некалькіх сотняў метраў да 100 кіламетраў. Магчымыя некалькі розных тэхналогій, якія выкарыстоўваюцца ў размеркаваных электрастанцыях: сонечныя, наземныя ветравыя турбіны, рачышчавыя гідраэлектрастанцыі, біяэлектрастанцыі і геатэрмальныя электрастанцыі.

**3. Выкарыстанне малых мадэляў ветравых тэхналогій** у вытворчасці электраэнергіі для раёнаў, якія не падлучаны да цэнтральнай электрасеткі, пры дапамозе акумулятарных батарэй.

**4. Выкарыстанне сонечнай энергіі прыватнымі хатнімі гаспадаркамі і малымі прадпрыемствамі.** Істотнае скарачэнне кошту сонечных дахавых фотаэлектрычных сістэм прыводзіць да "сеткавага парытэту" практычна ва ўсіх прамыслова развітых краінах. Такім чынам, хатнія гаспадаркі і малыя прадпрыемствы змогуць вырабляць сваю ўласную сонечную электрычную энергію з такімі ж ці меншымі выдаткамі, чым тарыфы на электраэнергію, якая пастаўляецца энергасеткамі.

**5. Аўтаномныя ацяпляльныя ці ахаладжальныя сістэмы,** падлучаныя да сістэм цэнтральнага ацяплення, выкарыстоўваюцца для цепла- або холадазабеспячэння асобнага будынка: сонечныя цеплавыя калектары, ацяпляльныя сістэмы, якія выкарыстоўваюць энергію біямасы і (геатэрмальныя) цеплавыя помпы (гэта гібрыдныя прылады, якія выкарыстоўваюць тэхналогіі аднаўляльнай энергіі і энергаэфектыўнасці, і цеплавыя помпы, якія ператвараюць 1 адзінку электрычнай энергіі ў 4 адзінкі цяпла).

**6. Увядзенне ў эксплуатацыю біягазавых комплексаў,** якія працуюць на адкідах жывёлагадоўлі і птушкагадоўлі, мясаперапрацоўкі, цукровых заводаў, сцёкавых вод. Падобныя комплексы дазваляюць выпрацоўваць электраэнергію з біягазу, які атрымліваецца пры закісанні арганічных адкідаў. Прычым біягазавыя ўстаноўкі не толькі вырабляюць электрычную і цеплавую энергію, але і высакаякасныя ўгнаенні, забяспечваюць утылізацыю адкідаў, скарачаюць выкіды метану ў атмасферу.

**7. Укараненне інтэлектуальных (разумных — smart-grid) сістэм кіравання генерацыяй і размеркаваннем электраэнергіі.** Павелічэнне долі генерыруючых магутнасцяў размеркаванай сонечнай і наземнай ветравой энергетыкі, падлучаных да размеркавальных і сярэдневольтных сетак, а таксама генерыруючых магутнасцяў ветравых і канцэнтраваных сонечных станцый, падлучаных да ліній электраперадач, патрабуе развіцця інфраструктуры як з пункту гледжання фізічнай устаноўкі, так і кіравання.





Акрамя таго, размеркаванне генерыруючых магутнасцяў паміж рознымі ўзроўнямі напружання патрабуе пашырэння электрасетак і/або магчымасцяў дыспетчарызацыі. У будучыні існуючыя газавыя трубаправоды і сховішчы могуць быць выкарыстаны для транспарціроўкі і захоўвання аднаўляльнага вадароду і/або метану.

**8. Інвестыцыйныя праекты АКЭ накіраваны на забеспячэнне больш інтэнсіўнага адкрыцця беларускага энергасектара для замежных інвестыцый.**
Цеплаэнергетычныя тэхналогіі на аснове аднаўляльных крыніц энергіі з'яўляюцца вельмі рознымі — ад нізкатэхналагічных печаў для спальвання біямасы і непакрытых сонечных калектараў да высокатэхналагічных і складаных геатэрмальных і сонечных сістэм. Такім чынам, неабходны дэталёвы разлік патрэбных аб'ёмаў інвеставання для рэалізацыі мер па маштабным укараненні АКЭ.

**9. Адукацыя і падрыхтоўка кадраў для аднаўляльнай энергетыкі ў сувязі са з'яўленнем новых кампетэнцый у будаўніцтве і кіраванні энергааб'ектамі на аснове АКЭ.**
Устойлівасць транспартнага сектара будзе забяспечвацца пры дапамозе трох розных падыходаў:

**Рацыянальнае выкарыстанне:** адмова ад выкарыстання транспарту, калі ў гэтым няма абгрунтаванай неабходнасці, з дапамогай развіцця мадэлі "кампактнага горада".
**Змена відаў транспарту:** стымуляванне выкарыстання больш устойлівых відаў перамяшчэння (такіх як грамадскі транспарт, хадзьба, язда на ровары) і адмовы ад выкарыстання прыватнага аўтатранспарту.
**Удасканаленне:** найменш эфектыўныя віды транспарту (напрыклад, прыватныя легкавыя аўтамабілі) павінны стаць максімальна эфектыўнымі.
Стратэгічным прынцыпам канцэпцыі гарадской мабільнасці, які спрыяе ўстойлівай мабільнасці, з'яўляецца якасць гарадскога асяроддзя, уключаючы вуліцы і прасторы, якія павінны стымуляваць выбар на карысць устойлівай мабільнасці, што, у сваю чаргу, павышае якасць жыцця, робячы яго бяспечным, эканамічна эфектыўным, устойлівым і інклюзіўным.

**10. Стварэнне комплексных гарадскіх і нацыянальных транспартных стратэгій,** планаў мабільнасці (сёння рэалізуюцца толькі ў гарадах Полацку і Наваполацку). Гэтыя дакументы павінны ахопліваць усю транспартную праблематыку. Неабходна праводзіць мерапрыемствы па развіцці пешаходнага і роварнага руху, партатыўнага транспарту, затым грамадскага пасажырскага транспарту, затым асабістага аўтамабільнага транспарту.

**11. Укараненне механізмаў кіравання транспартным попытам.** На сёння прымяняюцца толькі платныя паркоўкі ў гарадах, аднак прапануюцца для разгляду наступныя пазіцыі: стварэнне зон платнай аўтамабільнай паркоўкі ва ўсіх цэнтрах вялікіх гарадоў, увядзенне платнага ўезду ў гарады, забарона транзітнага руху праз гарады, пераўтварэнне некаторых вуліц у пешаходныя, зніжэнне абмежавання хуткасці ў гарадах да 30 і 50 км/г, увядзенне сістэмы падаткаў, якая карэктуецца.

**12. Рэалізацыя горадабудаўнічых праектаў,** якія зніжаюць патрэбу ў перамяшчэнні жыхароў шляхам стымулявання будаўніцтва шматфункцыянальнай забудовы, якая зніжае патрэбу ў перамяшчэнні жыхароў.

**13. Укараненне механізмаў эканамічнай кампенсацыі негатыўнага экалагічнага ўздзеяння транспарту.** Неабходна распрацаваць метадалогію вызначэння поўных выдаткаў грамадства на паездкі рознымі відамі транспарту. Распрацаваць і ўкараніць эканамічны механізм, які б кампенсаваў грамадству ўтоеную субсідыю на выкарыстанне транспартнага сродку і стымуляваў грамадзян выкарыстоўваць найбольш экалагічна, энергетычна і эканамічна эфектыўны від транспарту.

**14. Развіццё гарадскога пасажырскага транспарту.** Неабходна стымуляваць павышэнне якасці і хуткасці пасажырскага транспарту, а таксама яго электрыфікацыі. Таксама стварэнне і паэтапнае ўкараненне транспартнай сістэмы, у якой можна лёгка камбінаваць віды транспарту. Развіццё розных формаў сумеснага выкарыстання паездак на аўтамабілі, стымуляванне адмовы ад валодання аўтамабілем у выключнай уласнасці (каршэрынг, карпул).



**15. Развіццё электрамабільнага транспарту.** Рэалізацыя распрацаванай і зацверджанай у лістападзе 2018 г. “Праграмы развіцця зараднай інфраструктуры і электрамабільнага транспарту ў Рэспубліцы Беларусь на 2016-2025 гг.”. Стварэнне дзяржаўнай зараднай сеткі для зарадкі электрамабіляў.

**16. Развіццё роварнага транспарту і байкшэрынгу.** Пастаноўка амбіцыйных мэт у галіне развіцця роварнага руху і распрацоўка адпаведных праграм, стымуляванне выкарыстання ровараў, стварэнне гарадскіх пракатаў ровараў.

**17. Развіццё пешаходнага руху і партатыўнага транспарту.** Неабходна стымуляваць выкарыстанне скутараў, сігвеяў, ховербордаў, самакатаў і іншага партатыўнага транспарту, ствараць пешаходныя вуліцы, змяняць характар вуліц на больш спрыяльныя пешаходнаму руху, змяняць адпаведныя нарматыўныя дакументы.

**18. Падрыхтоўка нарматыўнай базы для распаўсюджвання тэхналогіі беспілотных аўтамабіляў.**
Развіццё электрычных аўтамабіляў, павелічэнне доляў ветравой і сонечнай энергетыкі запатрабуюць выкарыстання тэхналогій акумулявання энергіі, такіх як вадарод, аднаўляльны метан і гідраакумулюючыя электрастанцыі.

**19. Акумуляцыя энергіі з дапамогай батарэй, партатыўных прылад захоўвання энергіі** (яны таксама ляжаць у аснове прывадных сістэм, такіх як транспартныя сродкі з гібрыдным прывадам і ўсе аўтамабілі з электрычным прывадам) павялічыць гнуткасць энергетычнай сістэмы для інтэграцыі электрасетак, забяспечыць збалансаванасць нагрузкі і надзейнага энергазабеспячэння.



Яўген Ярчак, TUT.BY

## ОРГАНЫ, ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЬ РАШЭННІ

Савет Міністраў,
Міністэрства энергетыкі,
Дэпартамент па энергаэфектыўнасці
Дзяржкамітэта па стандартызацыі.

## НАРМАТЫЎНЫЯ ПРАВАВЫЯ АКТЫ

Закон Рэспублікі Беларусь "Аб аднаўляльных крыніцах энергіі" (ад 27.12.2010 г. № 204-З).

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18.05.2015 г. № 209 "Аб выкарыстанні аднаўляльных крыніц энергіі".

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 06.08.2015 г. № 66265, якой рэгламентуецца механізм кватавання стварэння ўстановак, якія выкарыстоўваюць АКЭ.

Пастанова Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь № 100 "Аб тарыфах на электрычную энергію, што вырабляецца з аднаўляльных крыніц энергіі" ад 30.06.2011 г.

Канцэпцыя энергетычнай бяспекі (пастанова Савета Міністраў ад 23.12.2015 г. № 1084).

Нацыянальны план дзеянняў па развіцці зялёнай эканомікі ў Беларусі.

План мерапрыемстваў па рэалізацыі палажэнняў Парыжскага пагаднення да Рамачнай канвенцыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый аб змяненні клімату (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20.09.2016 г. № 345 у рэдакцыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 22.12.2018 г. № 491).

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 08.12.2010 г. № 625 "Аб некаторых пытаннях скарачэння выкідаў парніковых газаў".

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30.12.2005 г. № 1582 "Аб рэалізацыі палажэнняў Кіёцкага пратакола да Рамачнай канвенцыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый аб змяненні клімату".

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10.04.2006 г. № 485 "Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку вядзення Дзяржаўнага кадастру антрапагенных выкідаў з крыніц і абсорбцыі паглынальнікамі парніковых газаў".

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 04.05.2006 г. № 585 "Аб зацвярджэнні Палажэння аб нацыянальнай сістэме інвентарызацыі парніковых газаў".

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 25.08.2006 г. № 1077 "Аб Нацыянальным рэестры вуглародных адзінак Рэспублікі Беларусь".

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14.04.2009 г. № 466 "Аб парадку прадстаўлення, разгляду і маніторынгу праектаў па добраахвотным скарачэнні выкідаў парніковых газаў".

Стварэнне комплексных гарадскіх і нацыянальных транспартных стратэгій, планаў мабільнасці.

Падрыхтоўка нарматыўнай базы для распаўсюджвання тэхналогіі беспілотных аўтамабіляў.

# БАРАЦЬБА З КАРУПЦЫЯЙ (АНТЫКАРУПЦЫЙНАЯ ПЛАТФОРМА)






*“Не проста змагацца, а перамагчы!”*

*Анатоль Лябедзька*

**Арганізацыі, адказныя за распрацоўку праекта рэформы:**
Аб’яднаная грамадзянская партыя,
Аналітычны цэнтр “Стратэгія”,
Навукова-даследчы цэнтр Мізеса,
Цэнтр “Еўрапейскі дыялог”.

АБ’ЯДНАНАЯ ГРАМАДЗЯНСКАЯ ПАРТЫЯ

**Прапановы распрацаваны экспертамі:**
Леанідам ЗАІКАМ,
Мікалаем КАЗЛОВЫМ,
Анатолем ЛЯБЕДЗЬКАМ і
Яраславам РАМАНЧУКОМ.

## КАРОТКАЕ АПІСАННЕ

Антыкарупцыйная платформа Рэспублікі Беларусь 2021 г. уяўляе сабой сістэмны погляд на такую сацыяльна-эканамічную і інстытуцыйную з'яву, як карупцыя. Дакумент складаецца з ацэнкі прававой базы барацьбы з карупцыяй, яе маштабу, формаў праявы і сфер распаўсюджвання. Аналіз з'явы пададзены таксама праз шэраг міжнародных індэксаў і індыкатараў.

У другой частцы падаюцца рэкамендацыі па процідзеянні карупцыі ў Беларусі, якія згрупаваны ў тры блокі: 1) дэмакратызацыя і захаванне прынцыпаў прававой дзяржавы; 2) рэфармаванне сістэмы дзяржаўнага кіравання і рэгулявання; 3) месца, функцыі і задачы дзяржавы ў эканоміцы, дэкрыміналізацыя эканомікі.

Адзіным спосабам нейтралізацыі карупцыі з'яўляецца сістэмная, сінхранізаваная дзейнасць органаў дзяржкіравання, бізнесу і грамадства ў рэжыме палітычнай, грамадзянскай і эканамічнай свабоды. На пераходным этапе ад цэнтралізаванай планавай эканомікі і аўтарытарнай улады да дэмакратыі гэты падыход гарантуе прадухіленне ператварэння Беларусі ў алігархат і схематоз, вызваляе натуральны, чалавечы і прадпрымальніцкі капітал для стварэння свабоднай і паспяховай краіны.





voka.me

## АСНОЎНЫЯ МЭТЫ / ЗАДАЧЫ РЭФОРМЫ

Рэформа антыкарупцыйнай палітыкі прадугледжвае павышэнне празрыстасці дзейнасці і дэкамерцыялізацыю органаў дзяржкіравання, спрашчэнне адміністрацыйных працэдур і мінімізацыю ўмяшання чыноўнікаў у эканоміку.

## АСНОЎНЫЯ ЗАДАЧЫ:

Удасканаленне адкрытасці і празрыстасці фінансавай дзейнасці органаў дзяржкіравання.

Трансфармацыя дзяржаўнага кіравання з дапамогай інфармацыйных камунікацыйных тэхналогій (ІКТ) — механізмаў і паўнавартаснае развіццё электроннага ўрада (e-government).

Стварэнне эфектыўнай інфраструктуры (спецпракуратура, суды і іншыя інстытуцыі) па супрацьдзеянні карупцыі (у тым ліку з запрашэннем міжнародных экспертаў і спецыялістаў).

Ліквідацыя дзяржаўнай манаполіі і зарэгуляванасці ў інфармацыйнай сферы, галоўным чынам у друкаваных і электронных СМІ.

Скарачэнне функцый дзяржапарату па ўмяшанні і рэгуляванні эканамічнай дзейнасці.

## КРОКІ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ РЭФОРМЫ

**Аналітычнае абгрунтаванне**

Дэфіцыт дэмакратыі і свабоды слова, адсутнасць падзелу ўладаў, звышцэнтралізацыя палітычнай і эканамічнай улады, адсутнасць грамадскага і парламенцкага кантролю над дзейнасцю органаў дзяржкіравання і канфлікт інтарэсаў у іх, шырокае распаўсюджванне манапалістычных практык (у тым ліку ў сферы інфармацыі) — усе гэтыя фактары ператварылі Беларусь у краіну з высокім узроўнем карупцыі.

Беларускія ўлады ігнаруюць асноўныя прынцыпы і рэкамендацыі па барацьбе з карупцыяй не толькі нацыянальных аналітычных арганізацый, але і міжнародных структур, такіх як Група дзяржаў па барацьбе з карупцыяй Савета Еўропы (GRECO), ААН, АЭСР, Сусветны банк і Transparency International.

У дакладзе, які GRECO выпусціла ў 2019 г., было адзначана, што карупцыя ў нашай краіне носіць сістэмны характар. Асабліва пагрозлівая яна ў высокіх эшалонах улады і ў сектары дзяржаўных прадпрыемстваў. Пры гэтым прынццце фармальных дакументаў па процідзеянні карупцыі не памяншае маштабаў гэтай праблемы, а ўмяшанне прэзідэнцкай улады ў паўнамоцтвы ўладаў заканадаўчай і судовай, пры фактычнай адсутнасці кантролю і адказнасці, з'яўляецца небяспечнай крыніцай карупцыйных практык.

Да найбольш істотных парушэнняў, якія спрыяюць росквіту карупцыі ў нашай краіне, належаць: адсутнасць незалежнасці судовай улады, пракуратуры і праваахоўных органаў у цэлым; шырокая практыка надання імунітэту ад праследу за парушэнні закона; абмежаванне доступу да інфармацыі аб дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання; праца органаў дзяржкіравання ў рэжыме канфлікту (сумяшчэнне функцый заканадаўцы, рэгулятара, камерсанта, фінансіста, аўдытара і кантралёра).

Таксама міжнародныя і беларускія эксперты адзначаюць такія дэфекты беларускай сістэмы, як брак незалежнасці Канстытуцыйнага суда ў плане прызначэння і звальнення суддзяў, шырокія правы Прэзідэнта пры накладанні вета ці выдачы згоды на ўзбуджэнне крымінальных спраў, у тым ліку па карупцыйных справах дзяржслужачых, наймацнейшая цэнтралізацыя ўлады, дэфармацыя інстытутаў мясцовага самакіравання, кулуарная сістэма прыняцця рашэнняў і кантролю за іх выкананнем.

Усё гэта вядзе да страты бізнесам і грамадствам даверу да дзяржаўнай палітыкі, росту грамадскай апатыі і выняткаў вядзення камерцыйнай дзейнасці.

**Стан карупцыі ў Беларусі**

Прадстаўнікі беларускага бізнесу і банкаўскіх колаў наўпрост кажуць, што ў падмурку дзяржаўнай эканомікі ляжыць карупцыйная складаючая. Цэлы шэраг гучных карупцыйных спраў у сферах АПК, будаўніцтва, тэлекамунікацый, ЖКГ і машынабудаўніцтва дазваляе зрабіць выснову, што карупцыя зрабілася сістэмнай з'явай у Беларусі. Пры гэтым у нашай краіне дзяржаўны сектар – гэта 75-80% кошту ўсіх рэсурсаў і актываў, бюджэт органаў дзяржаўнага кіравання складае 42-47% ВУП.

У Беларусі ўсталяваны пэўны баланс рэгіянальных, галіновых і сілавых кадравых груповак-кустоў. Шклоўска-магілёўскія, віцебскія, брэсцкія аграрнікі, “чырвоныя дырэктары”-прамыславікі, будаўнікі, банкаўскае і сілавое лобі — усе яны ўплеценыя ў цела вертыкалі, суіснуюць у ёй, паразітуюць на ёй і пры гэтым канкуруюць за кавалкі агульна-га пірага, за павелічэнне кропак уплыву на Аляксандра Лукашэнку і ягонае бліжэйшае кола.

У гэтай сістэме арышт ці вынясенне прысуду адной ці нават некалькім асобам з аднаго “куста” пры пакіданні на волі іх непасрэднага начальніка з'яўляецца толькі імітацыяй барацьбы з карупцыяй, і гэтаму існуюць шматлікія пацвярджэнні. Напрыклад, пасля шэрагу скандалаў у Мінскім гарвыканкаме, у выніку якіх турэмныя прысуды атрымалі былы начальнік Галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Сяргей Барысевіч і былы намеснік старшыні гарвыканкама Андрэй Дамарацкі, сам былы “мэр” Андрэй Шорац не толькі не быў прыцягнуты да адказнасці, але і атрымаў кіруючую пасаду ў адной з дзяржаўных камерцыйных структур.

Карупцыя прысутнічае і на ўзроўні мясцовых улад. У прыватнасці, у дачыненні да былога кіраўніка Браслаўскага раёна суд вызначыў такія парушэнні закона, як хабар, завалоданне маёмасцю з выкарыстаннем службовых паўнамоцтваў, крадзеж, перавышэнне ўлады, махлярства і адмыванне грошай. Варта адзначыць, што ў карупцыйныя схемы мясцовага ўзроўню ўключаюцца таксама кіраўнікі ўзроўню нацыянальнага.

Шырокае распаўсюджванне карупцыйных схем у Беларусі прыводзіць да гіганцкіх страт. Па ацэнцы, якая грунтуецца на глыбокіх інтэрв'ю з бізнесменамі, аўдытарамі, фінансістамі і кіраўнікамі прадпрыемстваў, пры штогадовым аб'ёме дзяржзакупак, дзяржзаказу ў 7-8 млрд долараў сума адкатаў/хабару складае ад 20 да 25%, ці 2-2,5 млрд долараў. Доступ да гэтых грошай мае вельмі вузкае кола асоб, кожная з якіх перад прызначэннем на пасаду праходзіць строгі кантроль з боку праваахоўных органаў, а таксама ўзгадняецца асабіста з Прэзідэнтам. На вяршыні гэтай карупцыйнай піраміды знаходзіцца 5-7 тыс. чалавек, ці менш за 0,1% насельніцтва Беларусі.

Істотная крыніца карупцыі — дзяржаўныя інвестыцыйныя і інавацыйныя праграмы. Гэтая крыніца штогод накіроўвае ў прыватныя рукі, на замежныя рахункі, у валютную гатоўку, нерухомасць ды іншыя актывы на сумы каля 1,5-2 млрд долараў.

Аб’ём шэрай эканомікі ў Беларусі ў 2019 г. можна ацаніць у мінімум 30% ВУП, ці каля 19 млрд долараў. Сярэднегадавы аб’ём “шэрай” эканомікі за 2005-2019 гг. склаў 12-15 млрд долараў, а аб’ём карупцыйнай рэнты — 3-5 млрд долараў. Карупцыйная рэнта перавышае сукупныя штогадовыя выдаткі на фінансаванне аховы здароўя і адукацыю.

**Ацэнка стану карупцыі ў Беларусі міжнароднымі арганізацыямі**

У справаздачах міжнароднай арганізацыі Transparency International адзначаецца паляпшэнне стану ў Беларусі ў адпаведнасці з Індэксам успрымання карупцыі. Са 123-га месца, якое Беларусь займала ў 2013 г., у 2019 г. яна ўзнялася на 66-е месца, зрабіўшыся лідарам сярод краін ЕАЭС. Тым не менш, эксперты гэтай арганізацыі ўказваюць на простую сувязь паміж абмежаваннямі свабоды слова і грамадзянскіх свабод, з аднаго боку, і дынамікай карупцыі — з іншага.

Інакш ацэньвае стан карупцыі ў Беларусі міжнародная асацыяцыя Trace International у супрацоўніцтве з амерыканскай арганізацыяй Rand Corporation. Па яе даных, па ўзроўні карупцыйных рызыкаў Беларусь адкацілася з 74-га месца ў 2014 г. на 108-е ў 2019 г.

Краінай з высокімі карупцыйнымі рызыкамі застаецца Беларусь і ў адпаведнасці з Індэксам якасці дзяржаўнага кіравання, методыку ацэнкі якога распрацавалі навукоўцы з Інстытута Сусветнага банка. Гэтая методыка грунтуецца на суб’ектыўных поглядах і ацэнках грамадзян, прадпрымальнікаў, экспертаў прыватнага сектара, дзяржаўнага кіравання і недзяржаўных грамадскіх арганізацый і лічыцца адной з самых якасных і ўсёабдымных.

У падмурак стратэгіі ліквідацыі карупцыі ў Беларусі павінна быць пакладзена глыбокая палітычная, інстытуцыйная і адміністрацыйна-прававая рэформа, якую варта праводзіць адначасова з рэзкім скарачэннем прысутнасці дзяржавы ў эканоміцы. Абавязковай умовай поспеху антыкарупцыйнай палітыкі з’яўляецца яе інклюзіўнасць, ажыццяўленне на прынцыпах рэальнага партнёрства дзяржавы, бізнесу і ўлады.

***1. Дэмакратызацыя, захаванне прынцыпаў прававой дзяржавы***

Асноўныя моманты: канстытуцыйная рэформа, накіраваная на аднаўленне прынцыпу падзелу ўладаў, палітычнай канкурэнцыі, стрымліванняў і процівагаў, паўнавартаснага партнёрства дзяржавы і грамадзянскай супольнасці ў кіраванні краінай, пераразмеркаванне паўнамоцтваў на карысць мясцовых органаў улады; аднаўленне ўмоў для правядзення ў Беларусі свабодных дэмакратычных выбараў па стандартах АБСЕ і Савета Еўропы; аднаўленне інстытутаў, якія гарантуюць свабоду слова; ліквідацыя перашкод для паўнавартаснага функцыянавання грамадскіх арганізацый; аднаўленне незалежнай судовай сістэмы і ўтварэнне якаснай сістэмы падрыхтоўкі суддзяў; увядзенне абмежавання на тэрміны знаходжання на пасадзе Прэзідэнта адной асобы — не больш за два тэрміны, Прэм’ер-міністра — не больш за пяць гадоў, міністра — не больш за пяць гадоў; заканадаўчае забеспячэнне выбарнасці суддзяў; прыняцце Стратэгіі антыкарупцыйнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь як базавага закона аб прынцыпах, механізмах і інструментах дзейнасці органаў дзяржкіравання па процідзеянні карупцыі; утварэнне Антыкарупцыйнага суда з адмысловымі паўнамоцтвамі; дэпалітызацыя і дэідэалагізацыя праваахоўных і кантрольных органаў; аднаўленне кантролю з боку парламента і мясцовых прадстаўнічых органаў над выканаўчай уладай; ліквідацыя Камітэта дзяржкантролю і ўтварэнне Падліковай палаты, мэта якой — кантроль і аўдыт дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання; рэалізацыя ў поўным аб’ёме Канвенцыі ААН супраць карупцыі, выкананне рэкамендацый GRECO па пытаннях процідзеяння карупцыі; увядзенне інстытута амбудсмена па процідзеянні карупцыі.

***2. Рэфармаванне сістэмы дзяржаўнага кіравання і рэгулявання***

Асноўныя моманты: ліквідацыя практык і адмена прававых актаў, якія дыскрэдытуюць суб’ектаў недзяржаўнай формы ўласнасці, абмяжоўваюць канкурэнцыю і надаюць асобным суб’ектам гаспадарання магчымасць не выконваць фінансавыя абавязкі перад дзяржавай ці іншымі камерцыйнымі суб’ектамі; устанаўленне парламенцкага і грамадскага кантролю над размеркаваннем дзяржаўных рэсурсаў; размяшчэнне ў свабодным доступе штогадовых паартыкульных справаздач аб прыбытках і выдатках структур дзяржаўнай улады; забеспячэнне поўнай празрыстасці фінансавых плыняў усіх органаў дзяржаўнага кіравання і прадпрыемстваў з доляй дзяржаўнага капіталу больш за 50%; ліквідацыя ідэалагічнай вертыкалі ўлады, аптымізацыя колькаснага складу органаў дзяржаўнага кіравання з абмежаваннем іх функцый і паўнамоцтваў; штогадовае дэклараванне ўсіх прыбыткаў і маёмасці бліжэйшых родзічаў дзяржаўных служачых, якія займаюць кіруючыя пасады ў органах дзяржаўнай улады, кантролю, а таксама прадстаўнічых і праваахоўных органах; увядзенне перыядычных праверак кіраўнікоў з органаў дзяржаўнага кіравання на дэтэктары хлусні; увядзенне забароны на сумяшчэнне адміністрацыйнай і камерцыйнай дзейнасці; ліквідацыя практыкі бясплатнага карыстання аўтамабілямі для дзяржаўных служачых і палітыкаў, пераход у рэжым набыцця транспартных паслуг органамі дзяржкіравання метадам аўтсорсінгу на карысць прыватных кампаній.

***3. Месца, функцыі і задачы дзяржавы ў эканоміцы, дэкрыміналізацыя эканомікі***

Асноўныя моманты: забарона на выдзяленне непасрэднай бюджэтнай падтрымкі камерцыйным арганізацыям незалежна ад формы ўласнасці; скарачэнне спіса ліцэнзуемых відаў дзейнасці да пераліку толькі тых відаў, якія могуць уяўляць непасрэдную пагрозу жыццю і здароўю чалавека; прыватызацыя большасці сродкаў масавай інфармацыі; ліквідацыя практыкі нарміравання паступленняў у бюджэт ад штрафаў, канфіскацый і нацыяналізацыі; паўнавартаснае развіццё электроннага ўрада; зацвярджэнне парадку правядзення ўсіх аўкцыёнаў, тэндараў і таргоў з абавязковай іх трансляцыяй у жывым эфіры; уключэнне ў Крымінальны кодэкс вызначэння тэрміна “прыбытак, атрыманы злачынным шляхам”; скарачэнне лімітнай стаўкі штрафу на юрыдычных асоб з 200 базавых да 20 базавых велічынь для суб’ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, а таксама штрафаў на грамадзян і індывідуальных прадпрымальнікаў – да ўзроўню, які не перавышае 1/3 яго сярэдняга месячнага заробку (прыбытку); падвышэнне парогавых значэнняў для прыцягнення да крымінальнай адказнасці па артыкулах 231 і 243 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, выключэнне з санкцый артыкулаў 231 і 243 пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі; выключэнне з КаАП пункта 4 артыкула 12.17; амністыя капіталу; амністыя асуджаных за здзяйсненне эканамічных злачынстваў; прыняцце нарматыўнага прававога акта аб абавязковай прыватызацыі стратных малых і сярэдніх дзяржаўных камерцыйных арганізацый у сферы рознічнага гандлю, лёгкай прамысловасці, дрэваапрацоўкі, вытворчасці гумавых і пластыкавых вырабаў, будаўнічых матэрыялаў; прыняцце заканадаўчага акта, які вызначае паняцце “рэйдарства”, а таксама апісвае інструменты і механізмы процідзеяння яму.



## ОРГАНЫ, ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЬ РАШЭННІ

Прэзідэнт,
Парламент,
Канстытуцыйны суд,
Вярхоўны суд,
Савет Міністраў.

## НАРМАТЫЎНЫЯ ПРАВАВЫЯ АКТЫ

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2015 г. № 305-З “Аб барацьбе з карупцыяй”.

Закон Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2003 г. № 204-З “Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь”.

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2014 г. № 112-З “Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў”.

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2003 г. № 174-З “Аб дэкляраванні фізічнымі асобамі даходаў і маёмасці”.

Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 1999 г. № 275-З.

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях ад 21 красавіка 2003 г. № 194-З.

Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 1999 г. № 296-З.

# РЭФОРМА ПА СТВАРЭННІ НОВЫХ ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАЎ



habr.com



*“Стварэнне новых працоўных месцаў — адна з галоўных задач новай улады. Менавіта гэта мера здолее спыніць эміграцыю беларусаў, запусціць эканоміку і створыць з Беларусі краіну дабрабыту.”*

*Старшыня АГП Мікалай Казлоў*

**Арганізацыі, адказныя за распрацоўку праекта рэформы:**
Аб’яднаная грамадзянская партыя,
Аналітычны цэнтр “Стратэгія”,
Навукова-даследчы цэнтр Місеса.

АБ’ЯДНАНАЯ ГРАМАДЗЯНСКАЯ ПАРТЫЯ

**Прапановы распрацаваны экспертамі:**
Станіславам БАГДАНКЕВІЧАМ,
Леанідам ЗАІКАМ,
Львом МАРГОЛІНЫМ,
Яраславам РАМАНЧУКОМ і
Міхаілам ЧЫГІРОМ.




## КАРОТКАЕ АПІСАННЕ

У Беларусі за апошнія 30 гадоў ніхто (у тым ліку ўрад) мэтанакіравана не займаўся ўвядзеннем ды ўкараненнем дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу. Краіна штогод губляла не менш за 50 тысяч працоўных месцаў, а гэта супараўнальна з насельніцтвам не самага маленькага беларускага горада. Вось ужо 12 гадоў (з 2008 г.) сярэдняя зарплата ў краіне ў доларавым эквіваленце вагаецца паміж 400 і 500 доларамі.

Для стварэння сучаснага рынку працы з невысокім беспрацоўем, магчымасцямі для моладзі, эканамічным патэнцыялам для інвестараў і прадпрымальнікаў неабходна ўсталяваць новы баланс інтарэсаў. У ім, безумоўна, ёсць месца для дзяржавы. Сёння сітуацыя з беспрацоўнымі зайшла ў тупік. Урад перашкаджае аптымізацыі рабочай сілы на дзяржаўных прадпрыемствах. Аднак асноўныя рашэнні аб выбары сфер дзейнасці, аб'ёме ды формах інвестыцый, месцы размяшчэння вытворчасці, колькасці працоўных месцаў, узроўні аплаты працы павінны прымаць інвестары. Менавіта прадпрымальнікі рэалізуюць ідэі на свае, а не на бюджэтныя грошы.

## ПРАБЛЕМЫ, НА РАШЭННЕ ЯКІХ НАКІРАВАНА РЭФОРМА

Праблемы на рынку працы Беларусі маюць інстытуцыянальны характар. Неабходным ёсць прыняцце комплексных праграм, якія закранаюць не толькі ўласна рынак працы, але і сферу адукацыі, рэгуляванне прадпрымальніцкай дзейнасці, заканадаўчыя абмежаванні і іншыя галіны дзяржаўнай палітыкі.
Для стварэння новых працоўных месцаў трэба якасная макраэканамічная палітыка, то бок: нізкая інфляцыя, дысцыплінаваная бюджэтная палітыка, шырокая прастора для прыватнай ініцыятывы і адказнасць за інвестыцыйныя рашэнні.

Існуючая ў Беларусі эканамічная мадэль мае шэраг недахопаў, якія стрымліваюць эканамічнае развіццё і рост дабрабыту грамадзян:
– Рынак працы празмерна зарэгуляваны. Складанасці з найманнем і звальненнем работнікаў, наяўнасць вялікай колькасці адміністрацыйных абмежаванняў блакуюць мадэрнізацыю рынку працы.
– Захаванне старой структуры занятасці пагаршае сітуацыю на рынку працы ў звязку з негатыўнымі дэмаграфічнымі тэндэнцыямі, хуткім развіццём тэхналогій, больш канкурэнтнымі ўмовамі для развіцця прадпрымальніцтва ў суседніх краінах, у Азіі і ў Еўрапейскім саюзе.
– Урад ігнаруе праблему монагарадоў, не надае належнай увагі дыверсіфікацыі рынкаў збыту і павышэнню канкурэнтаздольнасці краіны.
– Дзяржава не надае належнай увагі развіццю малога прадпрымальніцтва, перадачы льгот тым, хто за свой кошт стварае новыя працоўныя месцы.
– Празмернае ўмяшанне дзяржавы ў вызначэнне ўмоў працоўнага дагавора (кантракта) зніжае стымулы для працы на ўзаемавыгаднай аснове. Жорсткае рэгуляванне дзяржавай адносін паміж работнікам і наймальнікам спрыяе ўцечцы “мазгоў” і высокакваліфікаваных работнікаў ручной працы.
– Палітыка ўрада ў галіне стварэння і захавання працоўных месцаў засяроджваецца на падтрымцы буйных прадпрыемстваў дзяржаўнай формы ўласнасці з дапамогай грашовых уліванняў, хоць рэсурсы ў дзяржавы ва ўмовах эканамічнага крызісу скарачаюцца.





Вольга Шукайла, TUT.BY

## АСНОЎНЫЯ МЭТЫ / ЗАДАЧЫ РЭФОРМЫ

**1.** Распрацоўка перспектыўнай сістэмы поўнай і прадуктыўнай занятасці на аснове прыярытэту агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права.
**2.** Мэтанакіраваная палітыка па развіцці дыялогу паміж дзяржавай, працадаўцамі і прафсаюзамі.
**3.** Стварэнне сістэмы фінансавай, інфармацыйнай, адукацыйнай падтрымкі беспрацоўных і работнікаў, якія знаходзяцца ў зоне рызыкі страты працы.
**4.** Фармаванне спрыяльных умоў (дзелавога ды інвестыцыйнага клімату) для стварэння прадпрымальнікамі, прыватным бізнесам, замежнымі інвестарамі і буйнымі дзяржаўнымі прадпрыемствамі новых працоўных месцаў.
**5.** Мадэрнізацыя інфраструктуры (дарогі, электраэнергетыка, цеплавая энергетыка, тэлекамунікацыі, водазабеспячэнне, сістэма прыбірання смецця і абароны экалогіі) для прываблівання інвестараў.
**6.** Развіццё фінансавых інстытутаў, якія забяспечваюць доступ да грашовых рэсурсаў, неабходных для стварэння новых працоўных месцаў і рэалізацыі камерцыйных праектаў.
**7.** Пашырэнне рынкаў збыту, на якіх беларускія камерцыйныя арганізацыі могуць прадаваць свае тавары і паслугі без тарыфных і нетарыфных абмежаванняў. Гаворка ідзе, у першую чаргу, пра Расію, краіны праграмы “Усходняе партнёрства” і краіны Еўрапейскага саюза.
**8.** Адаптацыя сістэмы адукацыі Беларусі да патрабаванняў сучаснага рынку працы, паступовы рух нашай краіны да эканомікі ведаў.
**9.** Бяспека чалавека і прадпрымальніка, стабільнасць дзяржаўных інстытутаў, культура працавітасці.
**10.** Барацьба з карупцыяй.

## КРОКІ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ РЭФОРМЫ

**1. Стымуляваць індывідуальных прадпрымальнікаў да стварэння новых працоўных месцаў.**

У нашай краіне зарэгістравана 241,3 тыс. прадпрымальнікаў. Па найме і па дагаворах грамадзянска-прававога характару ў іх працуе ўсяго 53 тысячы чалавек. Між тым, патэнцыял гэтай эканамічнай групы на рынку працы вельмі вялікі. Для разняволення ІП неабходна прыняць такія першачарговыя меры, як:

– права свабоднага наймання работнікаў;
– зніжэнне ставак адзінага падатку ў тры разы;
– увядзенне патэнта;
– зніжэнне ставак арэнды ў аб'ектах, якія належаць органам дзяржаўнага кіравання, у тры разы;
– скарачэнне адміністрацыйнага цяжару напалову. Перш за ўсё неабходна вырашыць праблему суправаджальных дакументаў і сертыфікацыі.

У выніку на працягу двух гадоў ІП змогуць стварыць дадаткова да 300 тысяч новых працоўных месцаў. Гэтыя месцы будуць заняты як моладдзю, так і звольненымі з дзяржаўных прадпрыемстваў работнікамі. Новыя працоўныя месцы збольшага будуць створаны ў сферы гандлю ды грамадскага харчавання, побытавага абслугоўвання, рамонту жылля, транспарту, абслугоўвання транспартных сродкаў, гатэльнага бізнесу і прыдарожнага сэрвісу.

**2. Стварэнне спрыяльных умоў для развіцця малога бізнесу.**

У канцы 2019 г. у Беларусі працавала крыху менш за 109 тысяч суб'ектаў малога прадпрымальніцтва, на якіх было занята 830 тысяч чалавек. У пакеце комплекснай падтрымкі развіцця малога бізнесу павінны быць прадугледжаны наступныя захады:

– мадэрнізацыя дзелавога клімату;
– спрашчэнне сертыфікацыі прадукцыі, якая выпускаецца;
– дэманапалізацыя ўнутранага рынка;
– зніжэнне падатковай нагрузкі як мінімум на 40%;
– скарачэнне адміністрацыйнага цяжару з 15% выручкі сёння да 5-7%;
– лібералізацыя цэн;
– амністыя даходаў.

Малы прыватны бізнес на працягу трох гадоў стварыць у Беларусі не менш за 300 тысяч новых працоўных месцаў. Яны будуць запаўняцца звольненымі работнікамі мясцовых дзяржаўных прадпрыемстваў, моладдзю, а таксама працоўнымі мігрантамі з іншых абласцей ды гарадоў Беларусі. Малы бізнес краіны будзе рэалізоўваць свой патэнцыял у сферы паслуг, сельскай гаспадаркі, прамысловасці, у тым ліку ў перапрацоўчай, лёгкай, дрэваапрацоўчай вытворчасцях, у будаўніцтве, у вытворчасці праграмнага забеспячэння і развіцця інфраструктуры навучання, лекавання і адпачынку.



**3. Зрабіць усе магчымыя захады па прываблівнні замежных інвестараў, у тым ліку транснацыянальных карпарацый (ТНК).**

Сёння патэнцыял ТНК у Беларусі рэзка абмежаваны. Для яго паўнавартаснага скарыстання неабходныя наступныя меры:

– шырокамаштабная прыватызацыя;
– развіццё паўнавартаснага рынку зямлі;
– забеспячэнне незалежнасці судовай улады;
– стварэнне прававых гарантый правоў уласнасці;
– дэбюракратызацыя і дэманапалізацыя эканомікі;
– лібералізацыя бягучага і капітальнага рахункаў;
– прыняцце асноўных рынкавых нормаў і стандартаў Еўрасаюза для тавараў і паслуг;
– стварэнне зоны свабоднага гандлю з Расіяй, Украінай і Еўрапейскім саюзам.

У выпадку рэалізацыі вышэйзгаданых крокаў аб'ём прамых замежных інвестыцый павялічыцца з 2333 долараў на душу насельніцтва на 1 красавіка 2019 г. да 5000 долараў.

На працягу бліжэйшых гадоў замежныя інвестары і прадпрыемствы з замежным капіталам створаць у Беларусі, як мінімум, 400 тысяч працоўных месцаў. Павінны істотна палепшыцца галіновая і геаграфічная структура ўкладанняў. Новыя працоўныя месцы зоймуць вызваленыя работнікі дзяржаўных прадпрыемстваў, звольненыя дзяржаўныя службоўцы, выпускнікі ВНУ, прадпрымальнікі і скарочаныя супрацоўнікі сілавых структур. Новыя працоўныя месцы будуць ствараца пераважна ў высокатэхналагічных экспартна арыентаваных галінах прамысловасці, сектары паслуг і транспарце. Замежны капітал створыць шмат працоўных месцаў у фінансавым сектары, прамысловасці і інфраструктурных сектарах.

**4. Правесці рэструктурызацыю, мадэрнізацыю, частковую або поўную прыватызацыю вялікіх і сярэдніх дзяржаўных прадпрыемстваў.**

Дзеля гэтага неабходна прадугледзець наступныя захады:

– дэтаксікацыя актываў;
– ліквідацыя “мёртвага” капіталу;
– аптымізацыя колькасці старых працоўных месцаў;
– прывабліванне замежных або беларускіх партнёраў;
– адаптацыя стратэгіі развіцця да посткрызіснага попыту.

У выніку дзяржаўныя прадпрыемствы здолеюць стварыць 100 тысяч новых працоўных месцаў.

**5. Забяспечыць рэформы фінансавымі рэсурсамі.**

**Індывідуальныя прадпрымальнікі** будуць ствараць новыя працоўныя месцы пераважна на свае грошы, на пазычаныя рэсурсы ад сваякоў ды знаёмых. У якасці крыніцы крэдытных рэсурсаў для ІП неабходнымі з'яўляюцца спрыяльныя ўмовы і сістэма стымулаў для развіцця фінансавых установаў мікракрэдытавання і крэдытных саюзаў.

Ацэначна, каля 2 млрд долараў зберажэнняў ды прыцягнутых рэсурсаў ІП можа быць выкарыстана для стварэння новых працоўных месцаў. Новыя працоўныя месцы ў сферы гандлю і паслуг не патрабуюць наяўнасці вялікага капіталу для ўваходжання на рынак.

**Малое і сярэдняе прадпрымальніцтва (МСП)** разлічвае на свае зберажэнні, абаротны капітал, а таксама на банкаўскія крэдыты. Іх даступнасць, а таксама паляпшэнне ўмоў крэдытавання будзе спрыяць прыцягненню новага капіталу ў банкаўскую сферу, яе прыватызацыі і развіццю паўнавартаснага канкурэнтнага асяроддзя. Варта выключыць шырокі распаўсюджванне дыскрымінацыйных практык з боку дзяржаўных банкаў і іншых фінансавых арганізацый.

МСП робіцца партнёрам у рэалізацыі сумесных прадпрыемстваў з замежнымі інвестарамі. Інвестыцыйны патэнцыял малога і сярэдняга бізнесу, які будзе выкарыстоўвацца для стварэння новых працоўных месцаў, ацэньваецца ў 8 млрд долараў. Асноўныя сферы стварэння новых працоўных месцаў МСП — гэта оптавы і рознічны гандаль, грамадскае харчаванне, прамысловасць, будаўніцтва, камп'ютарныя і побытавыя паслугі, рэклама, паліграфічныя і кансалтынгавыя паслугі.

Праграма прадугледжвае актыўны ўдзел замежных інвестараў у прыватызацыі, а таксама стварэнне імі камерцыйных арганізацый "з нуля", гэтак званых інвестыцый "зялёнага поля". Асноўныя сферы стварэння новых працоўных месцаў замежным капіталам — гэта фінансавыя паслугі (банкі, страхавыя кампаніі, фонды), прамысловасць, інфраструктурныя сектары, здабываючая прамысловасць, паліўна-энергетычны комплекс, сельская гаспадарка, лагістыка і транспарт.

У спрыяльных умовах (добры інвестыцыйны клімат, абарона правоў прыватнай уласнасці, уступленне ў Сусветную гандлёвую арганізацыю (СГА), зона свабоднага гандлю з Расіяй, Украінай і Еўрасаюзам) замежныя інвестары могуць укласці ў Беларусь да 25 млрд долараў на працягу чатырох гадоў.

Цалкам або часткова прыватызаваныя вялікія і сярэднія дзяржпрадпрыемствы (у партнёрстве з прыватным беларускім ці замежным капіталам) будуць прыцягваць крэдыты банкаў, выпускаць свае аблігацыі, прапаноўваць пакеты акцый для патэнцыйных інвестараў, а таксама атрымліваць рэсурсы з дапамогай выхаду на фондавыя рынкі. Ацэначна інвестыцыйны патэнцыял вялікага і сярэдняга бізнесу (дзяржаўнага і прыватнага) складае каля 10 млрд долараў.





**ОРГАНЫ, ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЬ РАШЭННІ**

Парламент,
міністэрствы і ведамствы,
мясцовыя органы ўлады.

**НАРМАТЫЎНЫЯ ПРАВАВЫЯ АКТЫ**

Праграма стварэння новых працоўных месцаў павінна быць зацверджана адпаведным законам.

Рашэнне праблемы рэфармавання эканомікі, стварэння новых працоўных месцаў, прыцягнення інвестыцый запатрабуе прыняцця шэрагу заканадаўчых актаў, унясення зменаў практычна ва ўсе дзейныя кодэксы.

# РЭФОРМА ВЫБАРЧАГА ЗАКАНАДАЎСТВА



pravdaurfo.ru



*“У любой краіне дэмакратыя пачынаецца з выбараў — сумленных, празрыстых, канкурэнтных. Калі такіх выбараў няма, пра дэмакратыю казаць не прыходзіцца.”*

*Леў Марголін*

**Арганізацыі, адказныя за распрацоўку праекта рэформы:**
Аб’ядная грамадзянская партыя,
Цэнтр “Еўрапейскі дыялог”.

АБ’ЯДНАНАЯ ГРАМАДЗЯНСКАЯ ПАРТЫЯ

**Прапановы распрацаваны экспертамі:**
Валерыем ЖУРАКОЎСКІМ,
Антанінай КАВАЛЁВАЙ,
Віктарам КАРНІЕНКАМ,
Дзмітрыем КУЧУКОМ,
Анатолем ЛЯБЕДЗЬКАМ,
Львом МАРГОЛІНЫМ,
Міхаілам ПЛІСКАМ,
Валянцінай СВЯЦКАЙ,
Аляксеем СІГАЕВЫМ,
Аляксандрам СІЛКОВЫМ,
Валерыем УХНАЛЁВЫМ і
Аленай ЯСЬКОВАЙ.




## КАРОТКАЕ АПІСАННЕ

У Беларусі ўсе выбары, пачынаючы з 1996 г., праходзяць па сцэнары галасавання пратаколамі, а не бюлетэнямі. У выніку афіцыйныя лічбы галасавання не адпавядаюць рэальнаму волевыяўленню выбаршчыкаў. Клан, які кіруе Беларуссю, прызначае дэпутатаў Саветаў і парламента, а гэтаксама і Прэзідэнта. Гэтаму спрыяе закрытасць ад грамадскасці выбаркамаў усіх узроўняў, а таксама непразрыстасць падліку галасоў. Яскравым пацверджаннем гэтага стала прэзідэнцкая кампанія 2020 г.

Толькі сумленныя і свабодныя выбары могуць даць імпульс для выхаду краіны з хранічнага крызісу ў эканоміцы і сацыяльнай сферы. Прадстаўнікі палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў неаднаразова прапаноўвалі змены ў выбарчае заканадаўства, якія атрымлівалі высокую ацэнку беларускіх і міжнародных экспертаў. Аднак усе гэтыя прапановы сутыкаліся з упартым нежаданнем дзейнай улады што-небудзь мяняць у выбарчым працэсе.

Сёння на парадку дня стаяць ужо не нейкія кропкавыя змяненні, а распрацоўка якасна новага Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь.




ria.ru

## ПРАБЛЕМЫ, НА РАШЭННЕ ЯКІХ НАКІРАВАНА РЭФОРМА

Сістэмныя недахопы выбараў у Беларусі зафіксаваны ў Выніковых справаздачах місіі БДІПЧ/АБСЕ па назіранні за парламенцкімі выбарамі ў Рэспубліцы Беларусь 2016 і 2019 гг. Яны былі выкарыстаны распрацоўшчыкамі праекта новага Выбарчага кодэкса.
Сярод іншых недахопаў варта асабліва адзначыць ключавыя пункты для забеспячэння сумленных і празрыстых выбараў:

**1. Незбалансаваны склад выбарчых камісій і выключны ўплыў на іх выканаўчай улады.**
Выбаркамы фармуюцца з членаў аднаго працоўнага калектыву, арганізацыі або праўладных НДА. Прадстаўнікі апазіцыйных партый і грамадзянскай супольнасці звычайна не праходзяць праз гэты адбор, і ў камісіі трапляюць толькі адзінкі. У выніку выбарчыя камісіі залежаць ад палітычнага кіраўніцтва і прымаюць перадузятыя рашэнні, якія ім навязвае выканаўчая ўлада.

**2. Непрапарцыйныя абмежаванні правоў назіральнікаў.**
Гэта падрывае давер да выбараў і вынікаў галасавання. Апафеозам стала абсалютна незаконнае абмежаванне колькасці назіральнікаў на ўчастках для галасавання падчас кампаніі 2020 г.

**3. Поўная закрытасць ад грамадскасці працэсу галасавання і падліку галасоў, а таксама інфармавання пра вынікі галасавання.**
Гэта прыводзіць да завышэння яўкі выбаршчыкаў, а таксама да маніпуляцый з выбарчымі бюлетэнямі на карысць кандыдатаў ад улады.

Дзейнае заканадаўства не адпавядае міжнародным абавязкам Беларусі. Ніводныя выбары не былі прызнаныя міжнароднай супольнасцю, што перашкаджала наладжванню раўнапраўных палітычных і эканамічных сувязяў і, адпаведна, адмоўна ўплывала на развіццё Беларусі і, нарэшце, прывяло да палітычнага супрацьстаяння ўлады і народа ў другой палове 2020 г.





TUT.BY

## АСНОЎНЫЯ МЭТЫ / ЗАДАЧЫ РЭФОРМЫ

**Мэтаю** рэформы з’яўляецца вяртанне ў палітычнае жыццё беларусаў празрыстых і сумленных выбараў, а таксама павышэнне даверу выбарцаў да вынікаў галасавання.

**Задачы:**

✓ Стварыць умовы для дасягнення шырокага палітычнага прадстаўніцтва ў выбаркамах усіх узроўняў, у тым ліку для апазіцыйных партый і арганізацый грамадскай супольнасці (якія не фінансуюцца дзяржавай).

✓ Змяніць правілы праверкі сабраных подпісаў.

✓ Забяспечыць бесперашкодны доступ назіральнікам да ўсіх этапаў выбарчага працэсу.

✓ Прыняць дадатковыя засцерагальныя захады ад фальсіфікацый галасавання на даму ды датэрміновага галасавання, а таксама для забеспячэння празрыстасці падліку галасоў і падсумоўвання вынікаў.

✓ Змяніць умовы агітацыйнай кампаніі ўключна з бесперашкодным правядзеннем масавых мерапрыемстваў.

## КРОКІ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ РЭФОРМЫ

**1. Змена парадку фармавання ЦВК.**
ЦВК будзе фармавацца парламентам з ліку перш за ўсё прадстаўнікоў палітычных партый.

**2. Гарантаванае прыняцце ў склад выбарчых камісій членаў, вылучаных усімі кандыдатамі.**
Арганізацыі, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі, перш за ўсё палітычныя партыі, павінны мець гарантаванае права на ўключэнне сваіх прадстаўнікоў у камісіі ўсіх узроўняў. Гэта крок у бок прывядзення беларускага заканадаўства ў адпаведнасць з існуючымі абавязацельствамі Беларусі па Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах і Канвенцыі ААН супраць карупцыі.
**Выбарчы кодэкс:** артыкулы 33-34.

**3. Пашырэнне правоў назіральнікаў.**
Назіральнікі павінны мець доступ да:
– выбарчых спісаў;
– даных па колькасці выбаршчыкаў у выбарчых спісах;
– даных па колькасці выбаршчыкаў, якія запісаліся для галасавання па месцу знаходжання;
– даных па колькасці тых, хто прагаласаваў у дні правядзення датэрміновага галасавання;
– даных па колькасці ўсіх, хто прагаласаваў па ўсіх відах галасавання.
Назіральнікі павінны мець магчымасць рабіць аўдыёзапіс, фота- і відэафіксацыю, назіраць за падлікам галасоў выбаршчыкаў ва ўмовах, якія забяспечваюць празрыстасць працэдуры падліку бюлетэняў, а таксама даюць магчымасць праверкі вынікаў падліку галасоў.
**Выбарчы кодэкс:** артыкул 10.

**4. Узмацненне патрабаванняў да датэрміновага галасавання.**
Прычыны для датэрміновага галасавання павінны абавязкова пацвярджацца дакументальна. Для правядзення датэрміновага галасавання на тэрыторыі выбарчай акругі (або ў кожным раёне) вызначаецца толькі адзін участак для галасавання. Гэта дазволіць выключыць магчымыя злоўжыванні ды фальсіфікацыі, а таксама прымус выбаршчыкаў да датэрміновага галасавання.
**Выбарчы кодэкс:** артыкул 54.

**5. Рэгламентацыя патрабаванняў да галасавання на даму.**
У спісе для галасавання на даму неабходна пазначаць афіцыйную прычыну немагчымасці для выбаршчыка прыйсці ў памяшканне для галасавання. Гэта знізіць магчымасць злоўжыванняў у выглядзе штучнага падвышэння яўкі ды прымусу выбаршчыкаў да ўдзелу ў галасаванні.
**Выбарчы кодэкс:** артыкул 55.

**6. Дэманстрацыя кожнага бюлетэня членам выбаркама і назіральнікам.**
Падлік галасоў павінен ажыццяўляцца празрыста, ва ўмовах, калі ўсе члены ўчастковага выбаркама, назіральнікі і давераныя асобы кандыдатаў могуць пацвердзіць вынік. Абавязковымі з’яўляюцца абвяшчэнне і дэманстрацыя выбару ў кожным бюлетэні ўсім прысутным, а таксама абвяшчэнне ўсіх лічбаў, якія ўносяцца ў выніковы пратакол.
**Выбарчы кодэкс:** артыкул 56.






**ОРГАНЫ, ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЬ РАШЭННІ**
Парламент.

**НАРМАТЫЎНЫЯ ПРАВАВЫЯ АКТЫ**
Выбарчы кодэкс.

openmedia.io

# РЭФОРМА МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ






*“Адзіная крыніца ўлады — народ! Мясцовае самакіраванне самае бліжэйшае да народа і яму падсправаздачнае. Будзе мясцовае самакіраванне — будзе ўлада народа!”*

***Аляксандр Жучкоў***

**Арганізацыя, адказная за распрацоўку праекта рэформы:**
Партыя БНФ.

ПАРТЫЯ БНФ

**Прапановы распрацаваны экспертамі:**
Аляксандрам ЖУЧКОВЫМ і Андрусём КЛІКУНОВЫМ.




Виктор Толочки, sputnik.by

### КАРОТКАЕ АПІСАННЕ

Мясцовыя органы ўлады не прадстаўляюць інтарэсы мясцовага насельніцтва і ніяк ад яго не залежаць. Яны ўваходзяць у сістэму дзяржаўнага кіравання і стаяць на абароне інтарэсаў дзяржавы. Існуючая сістэма мясцовай улады стрымлівае ініцыятыву і развіццё мясцовых супольнасцяў. Яна прыводзіць да пашырэння валюнтарызму, безыніцыятыўнасці, безадказнасці і карупцыі на розных узроўнях.

Базавым суб'ектам мясцовага самакіравання павінна стаць самакіравальная тэрытарыяльная супольнасць грамадзян (Грамада). Кожны мясцовы жыхар, як прадстаўнік Грамады, будзе мець магчымасць уплываць на развіццё і ўладкаванне свайго населенага пункта і рэгіёна як непасрэдна, так і праз дэпутатаў. У выніку рэфармавання існуючай сістэмы можа быць дасягнута да 30% эканоміі дзяржаўнага бюджэту. Гэтыя сродкі могуць быць накіраваныя на добраўпарадкаванне, лепшыя дарогі і на іншыя мэты, якія вызначыць мясцовая Грамада.

## ПРАБЛЕМЫ, НА ВЫРАШЭННЕ ЯКІХ НАКІРАВАНА РЭФОРМА

1. Мясцовая супольнасць не мае магчымасці непасрэдна або праз сваіх прадстаўнікоў у выбарных органах самастойна вырашаць пытанні мясцовага значэння.

2. Мясцовая супольнасць не мае магчымасці планаваць, уплываць і кантраляваць развіццё сваіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Яна не можа кантраляваць і ўплываць на мясцовыя фінансы.

3. Выканаўчыя органы адсутнічаюць у сістэме мясцовага самакіравання, акрамя першаснага ўзроўню. Але і на першасным узроўні яны з’яўляюцца непадкантрольнымі ні мясцовай Грамадзе, ані адпаведнаму прадстаўнічаму органу.

4. Непадкантрольнае і непадсправаздачнае мясцовай Грамадзе іерархічнае мясцовае дзяржаўнае кіраванне (“вертыкаль”) пранізвае ўсю адміністрацыйна-тэрытарыяльную сістэму Беларусі.
Мясцовыя выканаўчыя органы фармуюцца цэнтралізавана, а іх старшыні прызначаюцца. Урад можа кіраваць дзейнасцю гэтых органаў.
Галоўнае месца ў сістэме тэрытарыяльнага кіравання належыць старшыням выканаўчых камітэтаў. Старшыні выканкамаў абласцей і г. Мінска прызначаюцца на пасаду Прэзідэнтам і зацвярджаюцца сесіяй адпаведнага Савета дэпутатаў. Старшыні раённых і гарадскіх выканкамаў прызначаюцца старшынямі абласных выканкамаў і таксама зацвярджаюцца сесіямі адпаведных Саветаў дэпутатаў.

5. Тры ўзроўні мясцовага кіравання і “мясцовага самакіравання” заснаваны на прынцыпах дэмакратычнага цэнтралізму. Гэта вядзе да дублявання прыняцця і выканання рашэнняў і, як вынік, затратнага фінансавання і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.

6. Мясцовыя Саветы маюць статус дзяржаўных прадстаўнічых органаў, што прыніжае іх самастойнасць і ролю.
Па законе Саветы маюць статус юрыдычнай асобы, але акрамя пячаткі і мінімальнага штату не маюць нават фармальных атрыбутаў улады (рахунку ў банку, Статута альбо Палажэння, якія рэгламентуюць іх дзейнасць). Саветы не маюць аператыўнага ўплыву на рашэнні мясцовых праблем, фінансава і адміністрацыйна цалкам залежаць ад дзяржаўнай адміністрацыі на мясцовым узроўні. Прадстаўнічыя органы не маюць сваіх выканаўчых і распарадчых структур, сваіх фінансавых і матэрыяльных сродкаў.
Ні ў адным нарматыўным дакуменце не абазначана адказнасць і справаздачнасць старшынь выканкамаў перад грамадзянамі.

7. Не ўсе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі маюць свае прадстаўнічыя органы ўлады, што супярэчыць Канстытуцыі.

8. Адсутнічае сістэма падрыхтоўкі кадраў для працы ў галіне мясцовага самакіравання. З праграм ВНУ знікла выкладанне такой дысцыпліны, як муніцыпальнае права.





rbc.ru

## АСНОЎНЫЯ МЭТЫ / ЗАДАЧЫ РЭФОРМЫ

Мэтай рэформы з’яўляецца дэмакратызацыя і дэцэнтралізацыя кіравання шляхам перадачы на мясцовы ўзровень самакіравання дастатковых паўнамоцтваў і рэсурсаў для павышэння якасці паслуг і набліжэння іх да грамадзян.

Сярод асноўных задач:
– Падзел кампетэнцый паміж органамі дзяржаўнага кіравання на месцах і органамі мясцовага самакіравання.
– Дакладнае размеркаванне задач паміж рознымі ўзроўнямі мясцовага самакіравання, каб выключыць дубляванне, а таксама павялічыць самастойнасць і адказнасць.
– Стварэнне фінансава-эканамічнай асновы мясцовага самакіравання шляхам заканадаўчага замацавання за мясцовымі прадстаўнічымі органамі ўласных бюджэтаў, маёмасці, зямлі і пашырэнне правоў у адносінах мясцовых падаткаў і збораў.

У выніку рэформы мы атрымаем збалансаваную і эфектыўную сістэму лакальнага і рэгіянальнага кіравання з дакладным і лагічным пераразмеркаваннем паўнамоцтваў.

## КРОКІ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ РЭФОРМЫ

**1. Замацаванне ў Канстытуцыі правоў грамадзян на ўдзел у прыняцці публічных рашэнняў праз органы мясцовага самакіравання.**
Інстытут мясцовага самакіравання дэкларуецца ў якасці адной з асноў канстытуцыйнага ладу нароўні з заканадаўчай, выканаўчай, судовай і прэзідэнцкай галінамі ўлады.
**Нарматыўны акт:** Канстытуцыя (V раздзел).

**2. Суб’ектам мясцовага самакіравання павінна стаць тэрытарыяльная супольнасць грамадзян (Грамада).**
Яна мае права рэалізоўваць свае паўнамоцтвы як непасрэдна, так і праз спецыяльна ўтвораныя мясцовыя органы.
**Нарматыўны акт:** Канстытуцыя, Закон аб мясцовым самакіраванні.

**3. Замацаванне самастойнасці органаў мясцовага самакіравання і неўваходжанне іх у сістэму органаў дзяржаўнай улады.**
Размежаваць кампетэнцыі розных узроўняў мясцовага самакіравання і дзяржавы.
Пытанні мясцовага значэння будуць вырашацца самастойна і пад сваю адказнасць выключна мясцовым самакіраваннем. Агульнадзяржаўныя пытанні, якія тычацца гэтай жа тэрыторыі, будуць вырашацца выключна органамі дзяржаўнай адміністрацыі, спецыяльна створанымі ўрадам краіны для гэтай тэрыторыі.
**Нарматыўны акт:** Канстытуцыя і Закон аб мясцовым самакіраванні.

**4. Прызнанне муніцыпальнай (камунальнай) уласнасці самастойнай формай уласнасці.**
Прызнанне муніцыпальнай (камунальнай) уласнасці самастойнай формай уласнасці дазволіць закласці эканамічны падмурак дзейнасці мясцовага самакіравання.
**Нарматыўны акт:** Канстытуцыя і Закон аб мясцовым самакіраванні, адпаведныя Кодэксы, якія закранаюць пытанні ўласнасці.

**5. Аб’яднанне першаснага і базавага ўзроўняў мясцовага самакіравання.**
Базавы ўзровень самакіравання з’яўляецца найбольш набліжаным да грамадзян. На базавым узроўні павінен канцэнтравацца найбольшы аб’ём паўнамоцтваў, а таксама адэкватны ім аб’ём матэрыяльных і фінансавых сродкаў для рэалізацыі гэтых паўнамоцтваў.
**Нарматыўны акт:** Канстытуцыя, Закон аб мясцовым самакіраванні.

**6. Размежаванне кампетэнцый розных узроўняў мясцовага самакіравання.**
Замацаваць за кожным узроўнем выключныя кампетэнцыі па пэўным коле пытанняў мясцовага значэння. Гэта ліквідуе канфліктную мадэль узаемаадносін і іерархічнасць розных узроўняў мясцовага самакіравання.
**Нарматыўны акт:** Закон аб мясцовым самакіраванні.



**7. Пераход на прапарцыйную або змяшаную сістэму пры выбарах у мясцовыя самакіраванні з магчымасцю прэферэнцый.**
Гэта прывядзе да максімальнага ўліку меркаванняў малых груп выбаршчыкаў і магчымасці прадстаўлення іх інтарэсаў у мясцовым органе ўлады. Акрамя таго, зробіць працу мясцовай улады больш эфектыўнай і празрыстай.
**Нарматыўны акт:** Канстытуцыя, Выбарчы кодэкс.

**8. Фармаванне прадстаўнічымі органамі мясцовай улады ўласных выканаўчых органаў.**
Прадстаўнічыя органы мясцовага самакіравання павінны мець права самастойна фармаваць мясцовыя выканаўчыя органы і кантраляваць іх працу. Мясцовы выканаўчы орган павінен быць падсправаздачны адпаведнаму прадстаўнічаму органу мясцовага самакіравання, а таксама тэрытарыяльнай супольнасці (Грамадзе).
**Нарматыўны акт:** Закон аб мясцовым самакіраванні.

**9. Узмацненне фінансавай самастойнасці мясцовага самакіравання.**
Замацаванне за мясцовым самакіраваннем уласных крыніц даходаў, пашырэнне іх паўнамоцтваў у сферы мясцовага падаткаабкладання, распараджэння муніцыпальнай уласнасцю і прыроднымі рэсурсамі, немагчымасць цэнтралізаванай канфіскацыі сродкаў з мясцовых бюджэтаў, а таксама стварэнне сістэмы выраўноўвання даходаў мясцовых самакіраванняў.
**Нарматыўны акт:** Закон аб мясцовым самакіраванні, Бюджэтны кодэкс, Падатковы кодэкс, Зямельны кодэкс, Грамадзянскі кодэкс.

**10. Стварэнне Саюзаў і Асацыяцый мясцовых органаў улады па тэрытарыяльных і функцыянальных прыкметах.**
Неабходна даць мясцовым органам улады права ўступаць у міжнародныя саюзы і асацыяцыі. Падобная практыка дазволіць больш эфектыўна вырашаць праблемы, якія стаяць перад кожным мясцовым самакіраваннем, а таксама адстойваць правы мясцовых самакіраванняў перад дзяржаўнымі органамі.
**Нарматыўны акт:** Закон аб мясцовым самакіраванні, Закон аб грамадскіх аб’яднаннях.

**11. Гарантыі і стварэнне пераемнасці ў дзейнасці мясцовага самакіравання.**
Стварэнне і дзяржаўная рэгістрацыя спецыяльных дакументаў — Статутаў (адзінак мясцовага самакіравання). Гэтыя дакументы рэгламентуюць парадак фармавання і дзейнасць кожнага органа мясцовага самакіравання. Статут павінен замацоўваць правы і абавязкі грамадзян і органаў улады на адпаведнай тэрыторыі і з’яўляцца дакументам, кансалідуючым тэрытарыяльную супольнасць грамадзян.
**Нарматыўны акт:** Закон аб мясцовым самакіраванні, Грамадзянскі кодэкс.

**12. Вырашэнне спрэчных пытанняў паміж органамі мясцовага самакіравання і дзяржаўнай адміністрацыі выключна праз суды.**
Абмежаванне і наступная ліквідацыя адміністрацыйнага, г. зн. пазасудовага парадку вырашэння канфліктаў у сферы мясцовага самакіравання. Адначасова з гэтым неабходна стварэнне адміністрацыйнай юстыцыі (Адміністрацыйны суд) як спецыяльнага судовага інстытута па вырашэнні спрэчных пытанняў і адстойванні правоў грамадзян, юрыдычных асоб, тэрытарыяльных супольнасцяў грамадзян і мясцовых органаў улады ў выпадку прыняцця мясцовымі і цэнтральнымі органамі ўлады рашэнняў або ажыццяўлення дзеянняў, якія парушаюць іх правы.
**Нарматыўны акт:** Канстытуцыя, Закон аб мясцовым самакіраванні, Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб судовым ладзе і статусе суддзяў.

**13. Стварэнне муніцыпальнай службы.**
Муніцыпальная служба ўяўляе сабой адмысловы від прафесійнай дзейнасці, існаванне якой абумоўлена спецыфікай мясцовага самакіравання як адмысловага ўзроўню (віду) публічнай улады.
Адмысловы прававы статус органаў і службовых асоб мясцовага самакіравання, у тым ліку муніцыпальных служачых, вызначаецца канстытуцыйнымі прынцыпамі арганізацыі мясцовага самакіравання.
Мясцовая (муніцыпальная) і рэгіянальная адміністрацыі (службы) выконваюць рашэнні і распараджэнні органаў мясцовага самакіравання па мясцовых пытаннях. Яны звязаныя з задавальненнем патрэб грамадзян, але не маюць дачынення да выканання дзяржаўных службовых абавязкаў (кампетэнцый).
Структура органаў мясцовага самакіравання вызначаецца грамадзянамі Грамады самастойна.
**Нарматыўны акт:** Канстытуцыя, Закон аб мясцовым самакіраванні, Закон аб муніцыпальнай службе.

**14. Правядзенне рэформы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу.**
Новая мадэль мясцовых органаў улады ўяўляе двухузроўневую (базавую і рэгіянальную) структуру публічнай муніцыпальнай улады арганізацыйна і функцыянальна выведзенай са сферы дзейнасці дзяржаўнай улады.
**Нарматыўны акт:** Канстытуцыя, Закон аб мясцовым самакіраванні, Закон аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным уладкаванні Рэспублікі Беларусь.



rosbalt.ru




Вольга Шукайла, TUT.BY

## ДАРОЖНАЯ КАРТА РЭФОРМЫ:

***Першы (пераходны этап, 2-4 гады).***

Прымаюцца рашэнні на канстытуцыянальным і заканадаўчым узроўнях.

Беларусь далучаецца да Еўрапейскай хартыі мясцовага самакіравання.

Уносяцца змены ў Канстытуцыю і адпаведныя законы.

Ствараецца адпаведнае Міністэрства па рэгіянальным і мясцовым развіцці, на якое і прыйдзецца асноўны цяжар па каардынацыі і рэалізацыі рэформы.

Праводзяцца выбары ў органы мясцовага самакіравання ў адпаведнасці з рэкамендацыямі АБСЕ.

Праводзіцца аналіз паспяховасці ходу рэформаў, распрацоўваюцца варыянты адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу краіны.

Арганізоўваецца шырокае публічнае абмеркаванне далейшай хады рэформы мясцовага самакіравання, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай пабудовы і варыянтаў выбарчай сістэмы.

Адначасова распрацоўваюцца варыянты рэформаў сацыяльнага забеспячэння, аховы здароўя, адукацыі і іншых сфер.

***Другі этап.***

На другім этапе праводзіцца адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа з улікам пераходна-га перыяду, прымаюцца адпаведныя заканадаўчыя і нарматыўна-прававыя акты. Праводзяцца выбары ў заканадаўчыя органы і прадстаўнічыя органы мясцовага і рэгіянальнага самакіравання на аснове новага Выбарчага кодэкса.



mediazona.by

## ОРГАНЫ, ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЬ РАШЭННІ

Прэзідэнт,
Парламент.

## НАРМАТЫЎНЫЯ ПРАВАВЫЯ АКТЫ

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

Бюджэтны кодэкс.

Выбарчы кодэкс.

Грамадзянскі кодэкс.

Падатковы кодэкс.

Закон “Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь”.

Закон “Аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным уладкаванні”.

Закон “Аб Савеце Міністраў”.

Закон “Аб асновах адміністрацыйных працэдур”.

Закон “Аб Камітэце дзяржаўнага кантролю і яго тэрытарыяльных органах”.

# РЭФОРМА ЖЫЛЛЁВА-КАМУНАЛЬНАЙ ГАСПАДАРКІ




*“Ад якасці дзейнасці жыллёва-камунальных службаў і прадпрыемстваў у фармаванні асяроддзя для пражывання чалавека, ад якасці забеспячэння жыхароў вадой, цяплом, электраэнергіяй і іншымі паслугамі, ад таго, які санітарны стан населеных пунктаў, залежыць не толькі здароўе людзей, але і сацыяльна-палітычны настрой насельніцтва.”*



*Старшыня Партыі БНФ*
*Рыгор Кастусёў*

**Арганізацыя, адказная за распрацоўку праекта рэформы:**
Партыя БНФ.

ПАРТЫЯ БНФ

**Прапанова распрацавана экспертам**
Рыгорам КАСТУСЁВЫМ.



onlinetrade.ru

## КАРОТКАЕ АПІСАННЕ

Сярод недахопаў існуючай сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі (ЖКГ) асноўнымі з'яўляюцца: пастаяннае павелічэнне выдаткаў на ўтрыманне гэтай галіны, рост тарыфаў на жыллёвыя і камунальныя паслугі, стратнасць або непрыбытковасць прадпрыемстваў ЖКГ, іх нізкая эфектыўнасць і страта рэсурсаў, высокая ступень зносу асноўных вытворчых фондаў.

У якасці мер па паляпшэнні стану сектара ЖКГ незалежныя эксперты прапануюць змены па трох напрамках: інвестыцыі ў эканомнае расходаванне рэсурсаў, забеспячэнне працы прадпрыемстваў жыллёва-камунальнай гаспадаркі на канкурэнтнай аснове і ўвядзенне сістэмы сацыяльных рахункаў, якія забяспечваюць адрасную падтрымку.

## ПРАБЛЕМЫ, НА ВЫРАШЭННЕ ЯКІХ НАКІРАВАНА РЭФОРМА

Ні рост тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі, ні павелічэнне аб'ёмаў бюджэтнага субсідавання на іх пакрыццё, ні намаганні адпаведных органаў улады практычна не ўплываюць на паляпшэнне якасці паслуг пры цяжкім фінансавым і эканамічным стане прадпрыемстваў ЖКГ.

**1. Неэфектыўнасць кіравання галіной і ўпраўленчай сістэмы.**
У незалежнай Беларусі з часоў СССР захавалася практыка, пры якой мэты і задачы праграмных дакументаў разыходзіліся з рэальнасцю і не выконваліся. Так, Нацыянальная жыллёвая праграма была прызнана састарэлай у 2003 г., а яе вынікі не былі здавальняючыя. Яе замяніла Канцэпцыя развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі (ЖКГ) да 2015 г., якая таксама не прынесла плёну і была скасавана ў 2013 г., нягледзячы на засваенне значных сродкаў падчас спроб яе рэалізацыі. З 2014 г. па 2017 г. у краіне адсутнічала канцэпцыя развіцця і рэфармавання ЖКГ.

Новая Канцэпцыя ўдасканалення і развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі да 2025 г. не прадугледжвае вырашэнне асноўных задач па ліквідацыі манапалізму, забеспячэнні канкурэнцыі, а таксама эфектыўнай эксплуатацыі жылфонду і інфраструктуры ЖКГ; па павышэнні якасці і зніжэнні сабекошту жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП).

Грувасткасць кіравання галіной выклікана вялікай колькасцю ўпраўленчых звенняў на ўзроўні абласцей, раёнаў і гарадоў. Яны часта дублююць упраўленчыя функцыі вышэйшага ўзроўню, што стварае раздзьмуты адміністрацыйны апарат. Праз-мерная зарэгуляванасць сферы праяўляецца ў падвойным падначаленні арганізацый. У частцы нарматворчасці яны падпарадкоўваюцца Мінжылкамгасу, а па выкананні сваёй дзейнасці — мясцовым уладам: гарадскім, раённым і абласным выканкамам.

**2. Манаполія дзяржавы на аказанне жыллёва-камунальных паслуг і адсутнасць канкурэнтных адносін.**
Сумяшчэнне дзяржавай функцый уласніка жылога фонду і гаспадарчай дзейнасці прыводзіць да адсутнасці стымулаў для павышэння эфектыўнасці кіравання жылым фондам, яго эксплуатацыі і рамонту. Да гэтай пары каля 80% жыллёвага фонду знаходзіцца на абслугоўванні дзяржаўных камунальных прадпрыемстваў. Толькі каля 1% рынку займаюць прадстаўнікі прыватнага бізнесу ў гэтай сферы, яшчэ частка таварыстваў уласнікаў і арганізацый забудоўшчыкаў самастойна ажыццяўляюць тэхнічнае абслугоўванне жылля. Пры гэтым на 2018 г. з агульнага жылфонду (256 млн $м^2$) у прыватнай уласнасці знаходзілася каля 95% (241,4 млн $м^2$).

Структура фінансавання жыллёвага будаўніцтва ў Беларусі па-ранейшаму арыентаваная на дзяржаўны сектар. Роля прыватных інвестыцый і рынкавага фінансавання жыллёвага будаўніцтва застаецца нязначнай. Дзяржаўныя кампаніі і банкі пераважаюць як у жыллёвым будаўніцтве, тэхнічным абслугоўванні жылля, рэканструкцыі і кіраванні, так і ў сістэме фінансавання будаўніцтва жылля. Уся інфраструктура ЖКГ краіны знаходзіцца ва ўласнасці мясцовых улад.

Пастаянна адбываецца рост тарыфаў на ЖКП, а пакрыццё насельніцтвам выдаткаў ЖКГ захоўваецца на ўзроўні каля 50%. Ужо ў 2000-2005 гг. рост тарыфаў для насельніцтва на ЖКП апярэджваў агульны паказчык інфляцыі. Пры росце спажывецкіх коштаў за 2000-2005 гг. у 6,1 разы тарыфы на ЖКП павялічыліся ў 50,7 разоў. У выніку ўзровень пакрыцця плацяжамі насельніцтва выдаткаў на ЖКП, акрамя электра- і газазабеспячэння, для стандартнай двухпакаёўкі ўзрос з 12% у 2000 г. да 42,4% у 2005 г. Разам з тым доля жыллёва-камунальных паслуг у спажывецкіх расходах насельніцтва ўзрасла з 3% да 9,1%.

**3. Вялікія страты энергарэсурсаў і высокае энергаспажыванне жыллёвага фонду.**
На патрэбы ацяплення і гарачага водазабеспячэння выдаткоўваецца каля траціны ўсяго выпрацаванага ў краіне цяпла. Пры гэтым амаль 95% жылых дамоў мае ўзровень энергаспажывання звыш 160 кВт·г на $м^2$ у год. Гэта значна вышэй, чым у развітых еўрапейскіх краінах з аналагічнымі кліматычнымі ўмовамі.

## АСНОЎНЫЯ МЭТЫ / ЗАДАЧЫ РЭФОРМЫ

Асноўнай мэтай рэфармавання ЖКГ з'яўляецца зніжэнне сабекошту пры захаванні прымальнай якасці жыллёва-камунальных паслуг і бясстратнае функцыянаванне сістэмы без бюджэтных выдаткаў.

Задачы:
- ✓ развіццё канкурэнтнага асяродку ў сферы ЖКГ праз дэманапалізацыю і развіццё прыватных прадпрыемстваў;
- ✓ удасканаленне сістэмы кіравання жыллёва-камунальнай гаспадаркай на ўсіх узроўнях;
- ✓ развіццё ў сістэме ЖКГ энерга- і рэсурсазберагаючых тэхналогій;
- ✓ удасканаленне сістэмы льгот, дыферэнцыяцыя аплаты за ЖКП у залежнасці ад якасці жылых памяшканняў і іх месцазнаходжання;
- ✓ пазбаўленне прадпрыемстваў ЖКГ няпрофільных аб'ектаў, эксплуатацыя, утрыманне, ахова якіх прыносіць велізарныя страты суб'ектам гаспадарання.



rgazeta.by

## КРОКІ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ РЭФОРМЫ

**Рэалізацыю рэформаў плануецца здзейсніць у два этапы.**

**На першым этапе (на працягу двух гадоў) неабходна правесці наступныя пераўтварэнні:**

**Крок 1.** Стварыць неабходныя нарматыўна-прававыя ўмовы для прыватызацыі і дзейнасці прыватных арганізацый, што дазволіць забяспечыць канкурэнцыю па аказанні паслуг.

**Крок 2.** Пазбавіць ЖКГ ад няпрофільных актываў. Для гэтага неабходна перадаць прыватнаму бізнесу такія паслугі, як гасцінічная гаспадарка, лазні, перапрацоўка бытавых адкідаў і ўтрыманне вуліц і двароў, рытуальна-пахавальныя паслугі.

**Крок 3.** Сфармаваць умовы для пашырэння недзяржаўных арганізацыйных формаў эксплуатацыі жыллёвага фонду — таварыствы ўласнікаў, сумесныя домаўладанні і іншыя формы.
Стварыць агульнанацыянальны саюз прыватных домаўладанняў, што палегчыць працэс рэфармавання, а таксама зменшыць магчымую напружанасць і дазволіць больш шырока ўлічыць меркаванне грамадзян. Жыллёвыя саюзы/асацыяцыі могуць забяспечыць істотную падтрымку ў прававым і нарматыўна-метадычным забеспячэнні жыллёвых прадпрыемстваў.

**Крок 4.** Падзяліць функцыі і дамоўныя адносіны паміж уласнікамі жылога фонду, ЖКГ і падраднымі арганізацыямі. Гэта дазволіць стварыць канкурэнтны асяродак шляхам дастатковага і своечасовага фінансавання на ўтрыманне і рамонт жыллёвага фонду, а таксама паралельным паніжэннем затратнасці функцыянавання прадпрыемстваў ЖКГ.

**Крок 5.** Перайсці да конкурснай асновы выканання ўсіх падрадных работ па рамонце канструктыўных элементаў жылых дамоў і капітальным рамонце жылога фонду ў г. Мінску і абласных цэнтрах краіны, а праз тры гады – ва ўсіх астатніх населеных пунктах.

**Крок 6.** Прыняць комплекс мер па змяншэнні спажывання энергіі жыллёвым фондам.
Прывесці ўсе аб'екты інфраструктуры ў належны тэхнічны стан, распачаць усталяванне менш энергаёмкага абсталявання, выкарыстання прагрэсіўных тэхналогій, завяршыць забеспячэнне крыніц і спажыўцоў прыборамі ўліку вады, уліку і рэгулявання цяпла. Прывесці да належнага стану цеплаізаляцыю цеплавых камер і цепласетак, частково здзейсніць пераход да дэцэнтралізацыі цеплазабеспячэння, у тым ліку і ў сельскай мясцовасці.

**Крок 7.** Вылучыць абслугоўванне сельскіх населеных пунктаў у асобную цэласную эканамічна самастойную сферу са сваім кіраваннем і фінансаваннем.

**Крок 8.** Стварыць у раёнах і гарадах арганізацыі водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі з правам юрыдычнай асобы.
Гэта дазволіць больш эфектыўна мадэрнізаваць дзейныя сістэмы водазабеспячэння і гарадской каналізацыі, удасканаліць упраўленне водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркай, знізіць неўліковыя расходы і страты вады.

**Крок 9.** Сфармаваць паўнавартасную сістэму прафесійнай падрыхтоўкі кадраў для ЖКГ з улікам пашырэння і развіцця недзяржаўных арганізацыйных формаў эксплуатацыі жыллёвага фонду.



**На другім этапе (цягам трох гадоў) прыняць наступныя захады:**

**Крок 10.** Правесці аптымізацыю ўпраўленчага апарату з ліквідацыяй разнастайных аддзелаў ЖКГ пры абл-, гар-, райвыканкамах.
Зэканомленыя ад удасканалення структуры кіравання сродкі можна выдаткаваць на ўзмацненне сацыяльнай падтрымкі найбольш уразлівых груп насельніцтва. Разам са скарачэннем бюджэтнага субсідавання тэхнічнае рэгуляванне пытанняў ЖКГ перадаць Мінбудархітэктуры разам з ліквідацыяй Мінжылкамгаса.

**Крок 11.** Давесці долю жыллёвага фонду, які абслугоўваецца на конкурснай аснове, да 80% за кошт стварэння і развіцця прыватных прадпрыемстваў.

**Крок 12.** Ахапіць рэгулярным зборам камунальных адкідаў і палігонамі для іх размяшчэння не толькі гарадскія і сельскія населеныя пункты, а таксама ўсе садовыя таварыствы. Забяспечыць збор, вываз, перапрацоўку і захоўванне камунальных адкідаў ва ўсіх населеных пунктах краіны толькі на конкурснай аснове прадпрыемствамі розных формаў уласнасці.

**Крок 13.** Прыняць меры па будаўніцтве з прыцягненнем інвестыцый заводаў па перапрацоўцы камунальных адкідаў з выхадам да 50% перапрацоўкі камунальных адкідаў ад іх агульнага збору да 2025 г.

**Крок 14.** Забяспечыць развіццё гарадскога электрычнага транспарту.
Стварыць сеткі электрычнага транспарту ў гарадах з насельніцтвам больш за 100 тыс. чалавек да 2025 г.

**Крок 15.** Завяршыць цеплавую мадэрнізацыю жылфонду, пабудаванага ў 1960-1990 гг. Гэта дазволіць зменшыць удзельны расход цеплавой энергіі ў панэльных дамах на 30-40% і, адпаведна, тарыфы на ЖКП.

## ОРГАНЫ, ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЬ РАШЭННІ

Савет Міністраў.

## НАРМАТЫЎНЫЯ ПРАВАВЫЯ АКТЫ

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь “Аб Канцэпцыі развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь да 2015 г.”.

# РЭФОРМА СІСТЭМЫ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ




*“Існуючая ў Беларусі мадэль сістэмы аховы здароўя па структуры і арганізацыйных прынцыпах дзейнасці захавалася на ўзроўні 70-х гадоў мінулага стагоддзя.*
*Для забеспячэння сучаснага ўзроўню медыцынскага абслугоўвання насельніцтва неабходна яе карэнная перабудова — увядзенне страхавой медыцыны па накапляльным прынцыпе, якая забяспечвае хуткае асваенне новых тэхналогій дыягностыкі і лячэння захворванняў, а таксама зацікаўленасць пацыентаў у захаванні свайго здароўя.”*



*Сяргей Мальчык*

**Арганізацыя, адказная за распрацоўку праекта рэформы:**
Партыя БНФ.

ПАРТЫЯ БНФ

**Прапанова распрацавана экспертам**
Сяргеем МАЛЬЧЫКАМ.




mindray.com

## КАРОТКАЕ АПІСАННЕ

Існуючая ў Беларусі постсавецкая мадэль дзяржаўнай сістэмы аховы здароўя па фінансавых магчымасцях, структуры, кадравым патэнцыяле, арганізацыйных прынцыпах дзейнасці не адпавядае сучасным патрабаванням.

Для забеспячэння сучаснага ўзроўню медыцынскага абслугоўвання неабходна ўвядзенне страхавой медыцыны па накапляльным прынцыпе, з захаваннем сацыяльных гарантый з боку дзяржавы для вызначаных сацыяльных груп насельніцтва. Гэты працэс доўгатэрміновы, працягласцю не менш за 10 гадоў.

У першыя 5 гадоў прапануецца правядзенне падрыхтоўчых мерапрыемстваў для хуткага і бяспечнага пераходу з бясплатнага дзяржаўнага да змешанага медыцынскага абслугоўвання з абавязковым медыцынскім страхаваннем для працаздольнага насельніцтва і захаваннем прынцыпу бясплатнасці для асобных сацыяльных груп, распрацоўка юрыдычнага заканадаўства, эканамічнага абгрунтавання, правядзенне структурных і кадравых рэформаў аховы здароўя.

У Беларусі захавалася з савецкіх часоў дзяржаўная сістэма аховы здароўя, якая фінансуецца з дзяржбюджэту і забяспечвае бясплатнае лячэнне пацыентаў. Атрыманая ў спадчыну беларускай медыцынай савецкая сістэма аховы здароўя не можа забяспечыць якаснага ўзроўню медыцынскай дапамогі, якая патрабуецца ў сучасных умовах:
– высокатэхналагічнага абсталявання для дакладнай і хуткай дыягностыкі;
– высакаякасных лекавых сродкаў і сучаснай апаратуры для эфектыўных і нетраўматычных прыёмаў лячэння;
– спецыялістаў высокага ўзроўню, якія могуць працаваць на гэтым абсталяванні.

## ПРАБЛЕМЫ, НА РАШЭННЕ ЯКІХ НАКІРАВАНА РЭФОРМА

**1. Недасканалая структура стацыянарных медыцынскіх устаноў** з вялікай іх доляй у райцэнтрах і сельскай мясцовасці, насельніцтва якой хутка памяншаецца.

Фінансаванне стацыянарных медустаноў у залежнасці ад наяўнасці ложка-месцаў і патрабаванні выканання іх планавага запаўнення (так званы ложка-дзень) робяць немагчымым павышэнне эфектыўнасці іх выкарыстання і тым больш скарачэнне. У гэтым не зацікаўленыя ні ахова здароўя, ні мясцовыя ўлады.

Больш за 1/3 шпіталяў прыходзіцца на ўчастковыя медустановы, разлічаныя ў сярэднім на 25 пацыентаў. Палова з іх забяспечваецца толькі медаглядам, а не лячэннем. Гэтыя шпіталі даўно пераўтвораны ў часовы сацыяльны прытулак для адзінокіх пенсіянераў.

Забяспечанасць ложка-месцамі ў стацыянарах значна перавышае рэальныя патрэбы, асабліва на раённым і гарадскім узроўнях, дзе лячэнне ў спецыялізаваных аддзяленнях не можа забяспечыць якаснае медыцынскае абслугоўванне.

**2. Амбулаторнае абслугоўванне — найбольш слабае месца аховы здароўя.**

З-за нізкіх заробкаў і высокай інтэнсіўнасці працы ў гэтых установах мае месца найбольшы недахоп медыкаў і частая змена спецыялістаў. Галоўныя прычыны гэтаму — прынцып фінансавання паліклінік у залежнасці ад колькасці наведванняў пацыентаў, нізкія нарматывы на час абслугоўвання аднаго пацыента, вядзенне ўсёй дакументацыі ўручную. Увядзенне пасады памочніка ўрача па амбулаторна-паліклінічнай працы прывяло да яшчэ большай колькасці папер, якія неабходна запаўняць.

Штогод колькасць наведванняў да ўрача складае больш за 10 на кожнага жыхара Беларусі. Гэта ў значнай ступені звязана з ільготнай сістэмай аплаты ліста непрацаздольнасці. Чарговая спроба рэфармавання паліклінічнай сістэмы праз замену ўчастковага тэрапеўта на ўрача агульнай практыкі адбываецца ў многім фармальна. Перавод тэрапеўтаў на пасаду ўрача агульнай практыкі патрабуе грунтоўнай перападрыхтоўкі па іншых спецыяльнасцях, што за 1 ці нават 3 месяцы курса павышэння кваліфікацыі зрабіць немагчыма. Запланаванае скарачэнне за кошт гэтага спецыялізаваных кабінетаў у паліклініках прывядзе да значнага пагаршэння якасці медыцынскага абслугоўвання.

**3. Выкарыстанне брыгад хуткай медыцынскай дапамогі не па профілю.**

Большая частка выклікаў брыгад хуткай медыцынскай дапамогі звязана з санітарнай перавозкай, патранажнай дзейнасцю (зрабіць ін'екцыю, памераць ціск і г. д.), а не аказаннем неадкладнай медыцынскай дапамогі.

**4. Амаль 35% медыкаў не займаюцца непасрэдна працай па сваёй спецыяльнасці.**

У сістэме аховы здароўя працуюць 58,5 тысяч медыкаў з вышэйшай адукацыяй і 126,6 тысяч спецыялістаў з сярэдняй медыцынскай адукацыяй. Аднак займаюць непасрэдна пасады ўрачоў-спецыялістаў толькі 48,9 тысяч чалавек.

9,4 тысяч кваліфікаваных медыкаў не займаюцца медыцынскім абслугоўваннем насельніцтва. Непасрэдна практыкуючых урачоў-спецыялістаў у Беларусі толькі 38,5 тысяч чалавек.

**5. Медыцынскія спецыяльнасці не карыстаюцца павагай з-за нізкай аплаты працы.**

Маладыя спецыялісты пасля атрымання спецыяльнасці масава эмігруюць у іншыя краіны. Вялікі каэфіцыент сумяшчальнасці сярод медыкаў уплывае на якасць медыцынскіх паслуг, зніжае магчымасці медперсаналу для павышэння кваліфікацыі.

Каэфіцыент сумяшчальнасці складае 1,36 па краіне, а з дадатковымі дзяжурствамі 1,5-1,75 у большасці практыкуючых спецыялістаў.

**6. Недастатковае фінансаванне сістэмы аховы здароўя.**

З бюджэту на ахову здароўя выдзяляецца ад 3,8 да 4,2% ВУП. Па долі ў ВУП гэта найлепшы паказчык сярод краін СНД, але ў параўнанні з еўрапейскімі краінамі ён адзін з найгоршых.

Размеркаванне гэтых фінансаў адбываецца нераўнамерна. На забеспячэнне рэспубліканскіх спецыялізаваных цэнтраў сучасным абсталяваннем і сродкамі для высакаякаснай дыягностыкі і эфектыўнага лячэння патрабуюцца значныя ўкладанні.

Аднак гэтыя цэнтры абслугоўваюць толькі нязначную долю пацыентаў. У той жа час, на нізавых узроўнях (раённы і гарадскі), дзе абслугоўваецца абсалютная большасць пацыентаў і дзе працуе большасць медперсаналу, выяўляецца значны недахоп фінансавання.



## АСНОЎНЫЯ МЭТЫ / ЗАДАЧЫ РЭФОРМЫ

**1.** Павышэнне якасці і даступнасці медыцынскіх паслуг.

**2.** Павышэнне эфектыўнасці працы ўстаноў аховы здароўя.

**3.** Павышэнне ўзроўню прафесіяналізму медыцынскіх работнікаў.

**4.** Павышэнне асабістай адказнасці грамадзян за сваё здароўе.

**5.** Зніжэнне выдаткаў дзяржаўнага бюджэту на ўтрыманне сістэмы аховы здароўя.



## КРОКІ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ РЭФОРМЫ

**Першы этап (2-3 гады):**

**1. Правесці комплексны аналіз сістэмы аховы здароўя:**
– коштаў медыцынскіх паслуг;
– коштаў штодзённага ўтрымання пацыента ў шпіталях розных спецыялізацыі;
– затрат медперсаналу на аказанне розных медыцынскіх паслуг;
– коштаў працы брыгад хуткай медыцынскай дапамогі на адзін стандартны выезд;
– коштаў утрымання асноўных фондаў медустаноў;
– запатрабаванасці тых ці іншых медпаслуг і рэальная ацэнка магчымасцяў медыцынскіх устаноў па іх рэалізацыі.

**2. На аснове комплекснага аналізу, пратаколаў дыягностыкі і лячэння пацыентаў з блізкімі групамі захворванняў неабходна:**
– распрацаваць медыка-эканамічныя стандарты і аб'ектыўныя крытэрыі па абгрунтаванні аб'ёмаў медпаслуг пры розных відах захворванняў;
– распрацаваць і афіцыйна зацвердзіць тарыфы і стандарты па аказанні комплексных медпаслуг і іх дыферэнцыяцыю ў залежнасці ад складанасці працэдур;
– акрэсліць аб'ектыўныя крытэрыі па абгрунтаванні пераводу пацыента на стацыянарнае лячэнне і лячэнне ў высокаспецыялізаваных цэнтрах;
– абгрунтаваць крытэрыі, якія даюць права да перагляду страхавых кантрактаў і права абскарджваць якасць медыцынскіх паслуг.

**3. Падрыхтаваць комплекс юрыдычных і эканамічных дакументаў, якія будуць рэгуляваць дзейнасць сістэмы аховы здароўя пры ўвядзенні страхавой мадэлі медыцынскага абслугоўвання.**

**4. Правесці шырокую інфармацыйную кампанію.**
Пры распрацоўцы зменаў у заканадаўстве да абмеркавання павінны быць прыцягнуты грамадскія арганізацыі, незалежныя эксперты і СМІ. Шырокая грамадская дыскусія павінна зрабіць законы дасканалымі і кансалідаваць грамадства, падрыхтаваць яго да радыкальных зменаў у сістэме аховы здароўя.

**Другі этап (3-5 гадоў) — рэструктурызацыя сістэмы аховы здароўя:**

**Установы аховы здароўя павінны быць пераўтвораны ў самастойныя адзінкі, якія маюць некалькі крыніц фінансавання.**
Павінны быць прыняты законы і палажэнні, якія рэгулююць:
– парадак аказання медпаслуг;
– узаемадзеянне і ўзаемаразлікі розных устаноў у аказанні комплекснай меддапамогі;
– парадак і механізм распараджэння сродкамі, атрыманымі медустановамі як з бюджэту, так і за аказанне медпаслуг па страхавых кантрактах.
Пераўтварэнне ўстаноў аховы здароўя ў самастойныя адзінкі і іх функцыянаванне ў канкурэнтным рынкавым асяродку ў перспектыве непазбежна прывядзе да замены галоўных урачоў на менеджараў і арганізатараў з іншымі функцыямі і магчымасцямі.

Бюджэтныя сродкі павінны выдзяляцца на ўтрыманне асноўных фондаў (будынкаў, абсталявання) і медыцынскае абслугоўванне вызначаных сацыяльных груп па адпаведных тарыфах і стандартах. Такое медабслугоўванне павінна фінансавацца дзяржавай.

Сродкі пацыентаў са страхавымі кантрактамі па ўстаноўленых тарыфах і стандартах за аказаныя медыцынскія паслугі павінны ісці на аплату працы медыкаў і набыццё сучаснага абсталявання.




Вольга Шукайла, TUT.BY

## ОРГАНЫ,
## ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЬ РАШЭННІ

Прэзідэнт,
Парламент.

***Падрыхтоўка і рэалізацыя рэформы:***
Міністэрства аховы здароўя.

***Актыўны ўдзел органаў мясцовай улады:***
выканкамы,
мясцовыя Саветы дэпутатаў.

## НАРМАТЫЎНЫЯ ПРАВАВЫЯ АКТЫ

Закон аб абавязковым медыцынскім страхаванні (увядзенне яго ў дзеянне да канца 2025 г.).

Палажэнне аб прынцыпах страхавання працуючых на прадпрыемствах і ўстановах усіх формаў уласнасці Беларусі.

Палажэнне аб установах аховы здароўя, якое замацоўвае пераўтварэнне ўстаноў аховы здароўя ў самастойныя адзінкі.

Палажэнне аб дзяржаўных гарантыях прадстаўлення застрахаваным пацыентам медыцынскіх паслуг, устаноўленых законам.

Палажэнне аб абароне правоў пацыентаў (працэс абскарджання).

# РЭФОРМА СЕКТАРА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ




tacyja.com

Надзея Бужан, NN.BY



*«Каб Беларусь была сапраўды незалежнай, а наша нацыя — свабоднай, каб кожны беларус меў годнае, заможнае і абароненае жыццё, патрэбна новая сістэма нацыянальнай бяспекі, якая змабілізуе дзяржаву на эфектыўную абарону нацыянальных інтарэсаў і будзе гарантаваць, што ўсе сілы і рэсурсы беларусаў выкарыстоўваюцца выключна на карысць нашага народа.»*

*Намеснік старшыні Партыі БНФ*
*Аляксей Янукевіч*

**Арганізацыя, адказная за распрацоўку праекта рэформы:**
Партыя БНФ.

ПАРТЫЯ БНФ

**Прапанова распрацавана экспертам**
Аляксеем ЯНУКЕВІЧАМ.




## КАРОТКАЕ АПІСАННЕ

Сітуацыя як унутры краіны, так і вакол яе, нясе вялікія пагрозы для нацыянальных інтарэсаў Беларусі. Асноўныя з іх — агрэсіўная знешняя палітыка Крамля, удзел Беларусі ў інтэграцыйных аб'яднаннях пад эгідай Расіі, дамінаванне расійскіх медыя ў інфармацыйнай прасторы і недастаткова высокі ўзровень нацыянальнай свядомасці беларусаў.

Асноўнымі напрамкамі рэфармавання існуючай дзяржаўнай палітыкі будуць: забеспячэнне дэмакратычнага ладу кіравання і вяршэнства закона; выхад з інтэграцыйных структур, дзе дамінуе Расія; захаванне і развіццё нацыянальнай культурнай спадчыны, беларускай мовы; забеспячэнне ўстойлівага эканамічнага росту за кошт вызвалення і развіцця прыватнага бізнесу; забеспячэнне высокага ўзроўню і якасці жыцця беларусаў.

У выніку рэфармавання істотна паменшацца цяперашняя ўразлівасць краіны ад знешняга ўмяшання і залежнасць ад Расіі, грамадства будзе скансалідаванае і падрыхтаванае да абароны дзяржаўнага ладу і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі.

## ПРАБЛЕМЫ, НА РАШЭННЕ ЯКІХ НАКІРАВАНА РЭФОРМА

**1. Агрэсіўная знешняя палітыка Крамля.**
Для рэалізацыі сваіх рэвізіянісцкіх, імперскіх планаў Крэмль актыўна выкарыстоўвае:
– эканамічны і энергетычны шантаж;
– інфармацыйны ціск;
– распаўсюджванне фэйкавых навін і дэзынфармацыі;
– апрацоўку эліт;
– фальсіфікацыю гісторыі з мэтай маніпуляцыі грамадскай свядомасцю;
– штучнае правакаванне і распальванне ўнутраных канфліктаў.
Крэмль выкарыстоўвае канцэпцыю “рускага свету” для атрымання кантролю над Беларуссю. Абгрунтаваннем для гэтага часта з’яўляецца цяперашняя расійскамоўная большасць беларусаў і шырокая прысутнасць Рускай праваслаўнай царквы.
Крэмль у сваёй працы актыўна выкарыстоўвае метады “мяккай сілы” праз НДА, фабрыкі думкі, СМІ, блогераў, сацыяльныя сеткі, абмены ды стажыроўкі ў Расію.

**2. Адсутнасць дэмакратыі, свабоды слова, свабоды сходаў ды іншых базавых свабод.**
Грамадзянская супольнасць і палітычная апазіцыя сутыкаюцца з жорсткімі абмежаваннямі сваёй дзейнасці і пераследам. У краіне больш за два дзесяцігоддзі няма свабодных і сумленных выбараў.
Незалежныя СМІ і блогеры — пад татальным жорсткім ціскам.

**3. Невысокі ўзровень нацыянальнай свядомасці і дамінаванне рускай мовы.**
Няздольнасць і нежаданне дзяржаўных ідэолагаў і дзяржСМІ канкураваць з прапагандай расійскіх медыя: расійскае тэлебачанне і радыё фактычна дамінуюць у медыйным полі Беларусі. Незалежныя СМІ знаходзяцца пад жорсткім ціскам.

**4. Праблемны стан беларускай эканомікі.**
Беларуская эканоміка сутыкаецца са значным зносам асноўных фондаў ды тэхналагічным адставаннем не толькі ад сусветных лідараў, але і ад суседзяў — краін ЕС. Выспявае праблема зыходу з краіны IT-кампаній ды іншага прыватнага бізнесу.

**5. Членства Беларусі ў інтэграцыйных наднацыянальных утварэннях, дзе дамінуе Расія — Саюзнай дзяржаве, АДКБ, ЕўрАзЭС, СНД.**
У складзе АДКБ беларусам пагражае ўцягванне ва ўзброеныя канфлікты ў Сярэдняй Азіі, а таксама па ўсім свеце. Праз удзел у АДКБ існуе пагроза выкарыстання азіяцкіх або расійскіх войскаў на нашай тэрыторыі. Прыналежнасць да АДКБ таксама замінае мадэрнізацыі войска.

**6. Змена прыярытэтаў і акцэнтаў у знешняй палітыцы Еўрапейскага саюза. ЕС сутыкаецца з нечуванымі міграцыйнымі выклікамі і наступствамі “Брэкзіту”.**
Многія краіны ЕС шукаюць кампрамісаў з Крамлём. ЗША не з’яўляюцца рэальным гарантам незалежнасці Беларусі, нягледзячы на актывізацыю двухбаковых стасункаў і цвёрдую прыхільнасць Вашынгтона да незалежнасці і суверэнітэту Беларусі.






## АСНОЎНЫЯ МЭТЫ / ЗАДАЧЫ РЭФОРМЫ

Асноўнай мэтай рэфармавання сектара нацыянальнай бяспекі з’яўляецца неадкладная мабілізацыя і кансалідацыя грамадства з мэтай абароны незалежнасці і суверэнітэту.

Задачы:
- ✓ умацаванне нацыянальнай ідэнтычнасці, падвышэнне патрыятызму ды пачуцця нацыянальнай годнасці;
- ✓ аб’яднанне грамадства на аснове дэмакратычных каштоўнасцяў і ідэі пабудовы вольнай незалежнай Беларусі;
- ✓ змяншэнне ўплыву Крамля на Беларусь, які цяпер рэалізуецца праз інфармацыйныя, эканамічныя, інтэграцыйныя і гуманітарныя чыннікі;
- ✓ выхад Беларусі з постсавецкіх інтэграцыйных аб’яднанняў з дамінаваннем Расіі;
- ✓ інтэграцыя ў заходнія палітычныя, эканамічныя і вайсковыя структуры (ЕС, НАТА).

## КРОКІ
## ПА РЭАЛІЗАЦЫІ КАНЦЭПЦЫІ

**Першачарговыя захады (да 2021 г.):**

**1. У палітычнай сферы:**
– выхад з “Саюзнай дзяржавы”, Еўразійскага эканамічнага саюза ды іншых інтэграцыйных утварэнняў, дзе дамінуе Расія;
– забарона прарасійскіх арганізацый, дзейнасць якіх супярэчыць нацыянальным інтарэсам, а таксама расійскіх фондаў ды арганізацый, што фінансуюць такія структуры;
– увядзенне крымінальнай адказнасці за публічныя выказванні, што аспрэчваюць існаванне асобнай беларускай нацыі і/або яе гістарычнага права на ўласную дзяржаву. Увядзенне крымінальнай адказнасці за публічныя абразы беларускай мовы;
– маніторынг сіламі грамадзянскай супольнасці дзейнасці пракрамлёўскіх ініцыятыў у Беларусі;
– ажыццяўленне памежнага і мытнага кантролю на мяжы з Расіяй.

**2. Забарона на продаж расійскім кампаніям стратэгічных аб’ектаў беларускай інфраструктуры.**

**3. У інфармацыйнай сферы:**
– вызваленне незалежных СМІ ад ціску і кантролю з боку дзяржавы, забеспячэнне свабоды СМІ і свабоды слова ў Беларусі;
– забарона трансляцыі ў Беларусі публіцыстычных грамадска-палітычных ды навінавых праграм, створаных расійскімі тэлеканаламі;
– уключэнне ў стандартны тэлевізійны пакет абавязковых агульнадаступных тэлеканалаў Латвіі, Літвы, Польшчы, Украіны, а таксама міжнародных англамоўных тэлеканалаў;
– аднаўленне сталай дзейнасці Грамадскай каардынацыйнай Рады ў сферы масавай інфармацыі.

**4. У ваеннай сферы:**
– выхад з АДКБ, вяртанне поўнага кантролю Беларусі над уласнымі сістэмамі супрацьпаветранай і супрацьракетнай абароны;
– вывад з тэрыторыі Беларусі расійскіх ваенных аб’ектаў — вузла сувязі ў Вілейцы і радыёлакацыйнай станцыі ў Ганцавічах;
– пашырэнне патрыятычнага выхавання ў беларускім войску з пазіцыі беларусацэнтрызму;
– перавод выхаваўчай працы ў войску на беларускую мову;
– развіццё памежнай інфраструктуры на межах з краінамі ЕС, падвышэнне прапускной здольнасці памежных пераходаў.

**5. У экалагічнай сферы:**
– забарона на будаўніцтва новых шкодных вытворчасцяў. Спыненне ўводу ў эксплуатацыю неэкалагічных прадпрыемстваў пасля незалежнага маніторынгу і экспертнага заключэння аб перавышэнні імі выкідаў у Брэсце, Магілёве і Светлагорску;
– апублічванне інфармацыі адносна будаўніцтва, бяспекі ды эксплуатацыі Астравецкай АЭС;
– правядзенне шырокай грамадскай дыскусіі адносна далейшага лёсу Астравецкай АЭС.

**6. У сацыяльнай сферы:**
– падвышэнне заробкаў ды паляпшэнне ўмоў працы работнікам аховы здароўя, адукацыі і культуры.

**7. У культурнай сферы:**
– папулярызацыя нацыянальных герояў з ухілам на XIX і XX стагоддзі;
– папулярызацыя асобы Кастуся Каліноўскага як палітычнага заснавальніка сучаснай беларускай нацыі, як сімвала змагання беларусаў за свабоду і незалежнасць і як постаці, што павінна кансалідаваць вакол сябе ўсіх адданых каштоўнасцям нацыянальнага адраджэння і незалежнасці краіны.

**Сярэднетэрміновыя задачы (да 2025 г.):**

**1. У палітычнай сферы:**
– рэформа выбарчага заканадаўства, правядзенне свабодных, сумленных і справядлівых выбараў;
– фармаванне Нацыянальнай гвардыі дзеля аховы парламента і захавання канстытуцыйнага ладу ў краіне;
– фармаванне Нацыянальнай службы бяспекі, падсправаздачнай парламенту;
– увядзенне прынцыпу падзелу ўлады. Забеспячэнне незалежнасці судовай і заканадаўчай улады ад выканаўчай улады;
– ажыццяўленне грамадзянскага кантролю, у першую чаргу з боку парламенту, над МУС і Узброенымі сіламі.

**2. У эканамічнай сферы:**
– дыверсіфікацыя паставак энерганосьбітаў, зніжэнне долі Расіі як пастаўшчыка энерганосьбітаў у Беларусь да 50% ад агульнага аб’ёму імпарту энерганосьбітаў;
– пашырэнне выкарыстання альтэрнатыўных крыніц энергіі;
– рэалізацыя дзяржаўнай Праграмы па энергазберажэнні, зніжэнне энергаспажывання і пераход на мясцовыя віды паліва;
– будаўніцтва новага нафтаперапрацоўчага завода ў Наваполацку, арыентаванага на лёгкую нафту;
– уключэнне Беларусі ў праграмы супрацоўніцтва ў межах ініцыятывы Трохмор’я з мэтай падрыхтоўкі неабходных дакументаў, праграм і інфраструктуры для далучэння Беларусі да будучай сістэмы паставак звадкаванага газу з ЗША ва Усходнюю Еўропу;
– прыватызацыя дзяржаўных прадпрыемстваў з забаронай набыцця кампаніямі з доляй расійскага капіталу большай за 20% акцый, стварэнне ўмоў для прыцягнення замежных інвестыцый;
– будаўніцтва сучасных чыгуначных шляхоў і магістральных аўтастрад Вільня — Мінск — Кіеў, Вільня — Гродна — Брэст — Львоў, Віцебск — Полацк — Дзвінск — Рыга.

**3. У інфармацыйнай сферы:**
– падвышэнне ўзроўню якасці беларускіх нацыянальных тэлеканалаў, стварэнне адмысловых грамадска-палітычных і гістарычных праграм;
– рэтрансляцыя нацыянальнымі тэлеканаламі навукова-папулярных, забаўляльных і навінавых праграм краін ЕС, Вялікабрытаніі, Канады, ЗША і Аўстраліі.

**4. У ваеннай сферы:**
– пераход беларускай арміі на стандарты НАТА;
– падрыхтоўка ваенных кадраў з накіраваннем беларускіх ваенных у адпаведныя навучальныя ўстановы і цэнтры краін НАТА;
– перавод на беларускую мову ўсёй жыццядзейнасці беларускага войска (служба, баявая работа, тэхнічнае абслугоўванне і г. д.);
– наданне беларускім вайсковым часцям і навучальным установам імёнаў беларускіх нацыянальных герояў;
– фармаванне беларускіх узброеных сіл з чатырох інтэгральных частак:
1. ядро з прафесіянальных ваенных, якія служаць на кантрактнай аснове;
2. грамадзяне, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу;

3. добраахвотныя тэрытарыяльныя адзінкі, сфармаваныя грамадзянамі, якія захоўваюць цывільныя заняткі, але праходзяць перыядычныя вучэнні і могуць быць хутка мабілізаваны;

4. рэзервы — усе прыдатныя да службы грамадзяне мужчынскага полу, якія прайшлі ваенную падрыхтоўку падчас тэрміновай службы.

– змена сістэмы падрыхтоўкі ваенных падчас тэрміновай службы і рэзервістаў. Фокус на патрыятычным выхаванні і набыцці неабходных навыкаў.
– змена працягласці абавязковай тэрміновай службы да шасці месяцаў;
– колькасць Узброеных Сіл без уліку рэзервістаў у межах 75–80 тыс. чалавек;
– стварэнне належнай інфраструктуры на мяжы Беларусі з Расіяй.

**5. У экалагічнай сферы:**
– стварэнне спрыяльных эканамічных умоў для інвеставання ў праекты атрымання энергіі з аднаўляльных крыніц ды перапрацоўкі і другаснага выкарыстання адкідаў;
– рэабілітацыя забруджаных радыяцыяй тэрыторый.

**6. У сацыяльнай сферы:**
– стварэнне ўмоў для вяртання беларусаў, што працуюць за мяжой, перадусім дактароў і медыцынскіх работнікаў, высокакваліфікаваных спецыялістаў іншых прафесій;
– спрыянне вяртанню нашчадкаў нашых суайчыннікаў, што з'ехалі з Беларусі да моманту аднаўлення дзяржаўнай незалежнасці, праз прыняцце закона аб карце суайчынніка — беларуса замежжа.

**7. У культурнай сферы:**
– вяртанне беларускай мове статусу адзінай дзяржаўнай, гарантаванне правоў нацыянальных меншасцяў на адукацыю і ажыццяўленне культурных мерапрыемстваў на роднай мове;
– распрацоўка і ажыццяўленне адміністрацыйных і фінансавых мер стымулявання беларускамоўных СМІ, кнігавыдавецтва, культурнага жыцця. Вяртанне дзяржаўных даплат за навучанне і выхаванне на беларускай мове ў дашкольных, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах;
– правядзенне комплекснай дэкамунізацыі і дэсаветызацыі Беларусі;
– заахвочванне дзяржавай беларусізацыі рэлігійнага жыцця ўсіх хрысціянскіх канфесій і іншых рэлігій;
– беларусізацыя сістэмы адукацыі ўсіх узроўняў і формаў;
– перагляд пытанняў, звязаных са скасаваннем дзяржаўнай рэгістрацыі ўстановам адукацыі (Дзяржаўны гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа і інш.).

**Доўгатэрміновыя мэты (да 2030 г.):**

– стварэнне скразной беларускамоўнай сістэмы адукацыі ад дзіцячых садкоў да ўніверсітэтаў;
– аднаўленне Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы як нацыянальнай альтэрнатывы Беларускаму экзархату РПЦ Маскоўскага патрыярхату;
– выкананне Беларуссю ўсіх крытэрыяў членства ў ЕС і НАТА, падача адпаведных заявак аб членстве ў гэтых структурах;
– забеспячэнне доўгатэрміновай харчовай бяспекі праз дыверсіфікацыю паставак у краіну прадуктаў, стварэнне харчовага запасу, мадэрнізацыю сельскагаспадарчай вытворчасці, развіццё фермерскіх гаспадарак;
– узмацненне супрацоўніцтва і фармаванне стратэгічнага партнёрства ў межах Балта-Чарнаморскай супольнасці, фармаванне і арганізацыйнае афармленне адпаведнага рэгіянальнага міждзяржаўнага блока;
– рэалізацыя праграмы дыверсіфікацыі паставак энерганосьбітаў з абмежаваннем долі пастаўшчыкоў любой з краін максімум 30% ад агульнага аб'ёму імпарту энерганосьбітаў.





reuters.com

**ОРГАНЫ,
ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЬ РАШЭННІ**

Прэзідэнт,
Парламент.

**НАРМАТЫЎНЫЯ ПРАВАВЫЯ АКТЫ**

Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Рэанімацыйны пакет рэформаў для Беларусі. — Мінск: Выданне РПР, 2021. — 136 с. Сумесная платформа палітычных арганізацый і незалежных экспертаў, якія аб’ядналіся, каб ініцыяваць пазітыўныя перамены ў Беларусі.

**Рэдактар**
Ігар Барысаў

**Карэктура**
Святлана Бушынская

**Дызайн і вёрстка**
Міхаліна Нарушэвіч

Падпісана да друку 25.01.2021 г.
Наклад 299 ас.
Надрукавана: Расійская Федэрацыя, г. Смаленск.

https://**zabelarus.**info

email: info@zabelarus.info

zabelarus.info